ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. ўдатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-86
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Адвел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

СУБОТА 19 красавіка 1930 г. № 91 (3599)

Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

БЛІЖЭЙШЫЯ ЗАДАЧЫ АСОАВІЯХІМУ

Магутнае разгортваньне сацыялістычнай індустрыі і рост калгаснага руху значна ўмацоўваюць абароназдольнасьць Савецкага Саюзу. Гэта і прымушае сусьветны імпэрыялізм сьпяшацца з новымі спробамі напасьці на апору сусьветнай рэвалюцыі, на край, у якім будуецца сацыялізм.

«Крыжовы паход» царкоўнікаў усіх колераў, падазроныя «візыты» розных генэралаў, шалёнае выцьцё буржуазнага друку супроць саветаў гаворыць аб тым, што імпэрыялістыя папрабуюць «папрабаваць» нашу магутнасьць, маючы на ўвазе скарыстаць у сваіх мэтах абваяньне клясавай барацьбы ў нашым краі.

У сувязі з гэтым павінна быць узмоцнена ўвага да вайсковай работы сярод насельніцтва, патрабуецца ўсямернае паляпшэньне работы па ўмацаваньні абароназдольнасьці краю, усебаковае ўзьняцьце работы Асоавіяхіму.

Каля 2-х месяцаў таму назад закрыўся 2-гі зьезд Асоавіяхіму і яго пастановы зьяўляюцца асноўнымі, пры дапамозе якіх гэта масавая арганізацыя здолее згуртаваць мільённыя масы асоавіяхімаўцаў і палепшыць сваю работу па іх ваянізацыі.

Асабліва важным зьяўляецца пытаньне аб паляпшэньні кіраўніцтва арганізацыямі Асоавіяхіму з боку партыйных арганізацый, акругкомаў, райкомаў і ячэек. Трэба шчыльна падысьці да пытаньня падбору кадраў для ўзмацненьня арганізацыі, для вылучэньня і выхаваньня новых атрадаў будаўнікоў сацыялізму, новых пластоў грамадзкага актыву асоавіяхімаўскіх арганізацый.

Сувязь камсамольскіх арганізацый з арганізацыямі Асоавіяхіму прымушае жадаць лепшага. Трэба адзначыць невыстарчальны ахоп работай таварыства камсамолу, пастановы якога аб 100-процантным уступленьні ў Асоавіяхім імя выкананы. Камсамольскія арганізацыі павінны прымаць большы ўдзел у кіруючай рабоце ячэек Асоавіяхіму, цікавіцца кіраўніцтвам гэтай работай. Трэба палепшыць справу з ваеннай падрыхтоўкай камсамольцаў, з шырокай ваеннай прапагандай сярод мас рабочай і сялянскай моладзі.

Агляд міжзборавай работы, які зараз праводзіцца, паказаў, што прафсаюзныя арганізацыі на ваенную работу зварачаюць вельмі мала ўвагі. Ваенная работа нідзе ня ўключана ў пляны работ прафарганізацый, у кіруючыя органы Асоавіяхіму не падбіраліся працаздольныя таварышы, ня цікавіліся пытаньнем падбору кадраў для работы ў Асоавіяхіме.

Асноўная задача прафарганізацый—значна палепшыць ваенную прапаганду, наладзіць у клюбах, ленкутках і прадпрыемствах масавую ваенную работу, уцягваць у Асоавіяхім новых членаў, а тым самым выконваць пяцігодку таварыства, каб давесьці колькасьць членаў Асоавіяхіму на Савецкім Саюзе да 17 мільёнаў чалавек.

Уцягваючы ў работу таварыства ўсё новыя пласты працоўных, пралетарскай грамадзкасьці трэба ўважліва сачыць за сацыяльным складам членаў, за суровым правядзеньнем генэральнай лініі партыі ва ўсёй рабоце таварыства.

У рабоце з начскладам запасу Асоавіяхім мае дасягненьні. Курсы па перадрыхтоўцы, гурткі па самападрыхтоўцы, завочнае навучаньне, практычны ўдзел у ваеннай рабоце арганізацый Асоавіяхіму, кіраўніцтва гурткамі і навучальна-страявымі адзінкамі заваявалі значны аўтарытэт сярод начскладу запасу.

Такія-ж дасягненьні мы маем і па лініі ваеннай падрыхтоўкі радавых членаў Асоавіяхіму, што адзначана апошнім загадам Рэвваенсавету СССР аб новых ільготах асоавіяхімаўцам, якія сконцылі асоавіяхімаўскія гурткі вайсковых ведаў.

Загад РВС СССР канстатуе, што «саюз Асоавіяхіму за апошні час разгортвае пырокую дзейнасьць па вайсковай падрыхтоўцы працоўных» і задача таварыства гэтыя посьпехі замацаваць і ўдасканаліць.

Аднак, ступень падрыхтаванасьці начскладу запасу яшчэ адстае ад тых патрабаваньняў, якія паставіць камандзіру сучасная баявая абстаноўка.

Рост ваеннай тэхнікі, ускладненьні тэхнікі сучаснага бою патрабуюць глыбокай перападрыхтоўкі начскладу запасу.

Разам з гэтым трэба зьвярнуць увагу на правядзеньне сярод начскладу палітычнай работы, накіраванай на згуртаваньне начскладу запасу вакол партыі, на мабілізацыю ўвагі вакол чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва і абароны краю.

Ва ўсёй рабоце Асоавіяхіму патрэбна адпаведная гібкасьць, каб ваенная прапаганда не адставала ад сучасных ўмоў, каб своячасова ўвязвалася штодзенная работа таварыства з чарговымі задачамі партыі.

У прыватнасьці, цяпер Асоавіяхім павінен разгарнуць вялікую работу па вярбоўцы ў вайсковыя школы, на падрыхтоўцы да чарговага прызыву з тым, каб забясьпечыць вайсковыя школы адпаведным кадрам і каб даць у рады Чырвонай арміі падрыхтаваную ў ваенных адносінах моладзь.

Ня гледзячы на тое, што прапант жанчын у арганізацыі няўхільна павышаецца, гэта павышэньне ўсё-ж ідзе марудна. Трэба ўзмацніць вярбоўку жанчын ў таварыства, абаперціся на кадры дэлегатак, арганізаваць шырокія масы работніц, калгасьніц і сялянак вакол мерапрыемстваў па правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі, стварыць «гектары абароны», паслаць сялянку-калгасьніцу на курсы на барацьбе са шкоднікамі сельскае гаспадаркі.

Асоавіяхім быў пінэрам і пачынальнікам у справе прапаганды ідэй хэмізацыі краю. Цяпер перад таварыствам у справе садзейнасьці хэмізацыі краю паўстаюць новыя задачы: шырока папулярызаваць ідэі хэмізацыі краю сярод працоўных мас, увязваючы гэта з пытаньнямі абароны краю і вялікімі задачамі, што стаяць перад хэмічнай прамысловасьцю ў сувязі з калектывізацыяй сельскае гаспадаркі.

Натуральна, што таварыству трэба ўсямерна дапамагаць матар'яльнымі сродкамі, шляхам арганізацыі мэтавага збору і адпусканьня іншых крыніц сродкаў для ўскладаньня іх у хэмічныя і авіяцыйныя фабрыкі і заводы.

Стан ваеннай прапаганды і бягучая работа Асоавіяхіму павінны рэгулярна асьвятляцца на старонках нашага друку.

Прапаганда вайсковых ведаў сярод працоўных—аснаўное зьвяно ў баявой падрыхтоўцы рабочых і сялян, што знаходзяцца па-за радамі Чырвонай арміі.

Друк павінен асабліва дакладна папулярызаваць пытаньні, зьвязаныя з ваеннай небясьпекай і выхоўваць шырокія масы працоўных да пастаяннай гатоўнасьці абараняць сваю пралетарскую дзяржаву.

Зусім зразумела, што гэтыя грандыёзныя задачы, што стаяць перад таварыствам, разам з усёй шырокай пралетарскай грамадзкасьцю, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, будуць выкананы. Гэтыя задачы патрабуюць, каб лёзунг сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва знайшоў сабе выстарчальнае прыстасаваньне і ажыцьцяўленьне ў практыцы ўсяе работы Асоавіяхіму.

Праводзячы гэтыя вялікія задачы ў жыцьцё, ні на адну мінуту нельга забываць аб самай галоўнай, самай аснўнай задачы, якая ўскладзена працоўнымі на наша таварыства — стварыць мільённыя рэзэрвы ўзброеных пралетараў, каб даць адпор нападу капіталу на першую ў сьвеце рэспубліку працы, край, у якім будуецца сацыялізм.

ПЕРАГІБЫ ПРЫ ЗЯМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНІ ТАРМОЗЯЦЬ СЯЎБУ

Дырэктывы партыі і ўраду аб зямляўпарадкаваньні ў радзе месц злачынна скажаюцца

У рашаючыя дні сяўбы даб'емся безадкладнага выпраўленьня дапушчаных памылак

ПАСЬПЯХОВЫ ХОД СЯЎБЫ Ў КАЛГАСАХ БРАГІНШЧЫНЫ

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ СЭКТАР АДСТАЕ

Грубыя, недапушчальныя скажэньні пры зямляўпарадкаваньні

8-га красавіка 41 калгас Брагінскага раёну (Гомельшчына) дружна пачаў калектыўную сяўбу. Першы дзень выхаду калгасаў у поле абярнуўся ў масаве сьвята калектывізацыі, у сьвята першай калектыўнай баразны.

Калгасы выйшлі на палявыя работы арганізаваным парадкам, добра і своячасова падрыхтаваўшыся да сяўбы. **Першы-ж за дзень ворыва быў адзначаны нячуваным уздымам і нябачанымі тэмпамі палявых работ.** Зараз сяўба ва ўсіх калгасах у поўным разгары. **Большая частка калгасаў на гэтым тыдні скончыць засеў ячменю, аўсу, яравое пшаніцы, канюшыны і вікі. Гэта будзе складаць ня менш 60-70 проц. яравога кліну калгасаў.** На наступным тыдні пачнецца масавая пасадка бульбы, засеў проса, ільну, грэчкі і інш. культур.

За 5 дзён 250 гаспадарак падалі заявы аб прыёме іх у калгасы. Арганізаваны тры новыя калгасы. У вёсцы Рычкава **адноўлен калгас з 27 гаспадарак,** які нядаўна быў распаўся. У Савіцкі калгас за два дні **вярнулася 40 гаспадарак. У калгас «Новая Беларусь» улілася 21 гаспадарка, у калгас «Юны ленінец»—17 гаспадарак** і г. д.

Але разам з гэтымі посьпехамі сяўбы на калектыўных палёх ужо зараз выяўлен і рад адмоўных бакоў. У некаторых калгасах адчуваецца недахват рабочае сілы. Гэта прыводзіць да таго, што ня ўся цягавая сіла скарыстоўваецца. Па некаторых-жа калгасах не хапае цягавай сілы і с.-г. інвэнтару, а праз гэта нельга скарыстаць поўнасьцю рабочую сілу. Тут адразу выявілася гаспадарчая і палітычная блізарукасьць раёнапага кіраўніцтва, якое злачынна пахавала ідэю арганізацыі машына-конных станцый.

Усё-ж на падставе вынікаў сяўбы першага тыдню можна быць упэўненым, што калгасы Брагінскага раёну правядуць веснавую сяўбу сапраўды пабальшавіцку і выканаюць пастаўленыя перад імі задачы.

На фоне энэргічнай і дружнай работы аграмаждзанага сэктару рэзка выяўляецца марудны тэмп палявых работ у індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках. У раёне пра індывідуальны сэктар дагэтуль амаль зусім ня думалі. Толькі зараз схамянуліся. Марудны тэмп палявых работ у індывідуальным сэктары ў значнай ступені тлумачыцца яшчэ скажэньнямі дырэктыў партыі і ўраду пры зямляўпарадкаваньні, якія былі дапушчаны ў некаторых мясцох.

Наводле пастановы СНК БССР пры зямляўпарадкаваньні калгасаў, некалгасьнікі павінны надзяляцца зямлёй, выходзячы з фактычнага зямлякарыстаньня згодна акладных лістоў.

Па дырэктыве Гомельскага акрэва некалгасьнікам адводзілі ня звыш 5 гэкт. усіх угодзьдзяў на гаспадарку, гэта значыць, рабілі незаконную абрэзку бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Гэтыя памылкі ў раёне яшчэ ня выпраўлены. Ёсьць выпадкі, калі вышаўшым з калгасу сялянам зусім не адвялі зямлі. У вёсцы Марытон з калгасу выступіла 24 гаспадаркі, заявы аб выхадзе былі паданы паўтара месяца таму назад, да зацьвярджэньня новага статуту. Праўленьне заяў не разьбірала, з калгасу ня выключала, коняй і інвэнтар таксама ня вярнула. Зямлі гэтым 24 гаспадаркам зусім не адвялі. Такі-ж факт меў месца ў вёсцы Мікулічах, дзе 18 гаспадаркам, якія вышлі з калгасу, яшчэ не адвялі зямлі. Ёсьць выпадкі адводу індывідуальным гаспадаркам зусім нязручнай зямлі.

Усе гэтыя недапушчальныя перагібы пры земляўпарадкаваньні дрэнна адбіваюцца на пасьпяховым разьвіцьці палявых работ у індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.

Раённыя арганізацыі павінны зараз-жа выправіць памылкі пры зямляўпарадкаваньні індывідуальных гаспадарак, забясьпечыць працоўнай дапамогай бядняцкія і маламоцныя серадняцкія гаспадаркі.

Брыгадзір «Зьвязды» ПЯЧОНКА.



КОЙДАНАЎСКАЯ ТРАКТАРНАЯ СТАНЦЫЯ

Пагроза недасеву ў саўгасе імя 10-годзьдзя БССР

Трактары не нагружаны з прычыны недахвату трактарыстых

Саўгас імя 10-годзьдзя БССР (Мар'інскі масыў) стаіць перад рэальнай пагрозай недасеву з прычыны нястачы калійных угнаеньняў (попелу, калійнай солі).

З занаражаных Наркамземам БССР 23 вагонаў карналіту (14 проц. калійная соль) пакуль што прыбылі толькі... два вагоны. Попелу саўгас павінен атрымаць 100 вагонаў, але пакуль што атрымана толькі 7 вагонаў. Ня гледзячы на частыя загады з боку ўпоўнаважанага засеўнай кампаніі па БССР тав. Рачыцкага на мясцох нічога ня робіцца па адгрузцы для саўгасу адпаведнай колькасьці попелу.

Але, нават, і з атрыманьнем занараджанай колькасьці карналіту саўгас здолее задаволіць ім свае патрэбы ня больш як на 50 проц. Такое становішча. бязумоўна, зьяўляецца пагрозай пасьпяховаму правядзеньню сяўбы. Паводле пляну саўгас павінен засеяць ў бягучую пасеўкампанію каля 1.500 гэктараў зямлі. Калі саўгас ня будзе своячасова забясьпечаны патрэбнай колькасьцю ўгнаеньня, дык стварацца сур'ёзная небясьпека няпоўнага выкананьня пляну.

Трактарнай цягавай сілай саўгас зараз забясьпечаны. Нядаўна прыбыло 27 новых трактараў, з якіх 7—гусеніччныя. Усе трактары зараз працуюць, разам з старымі трактарамі ў саўгасе працуюць 46 трактараў. Прычэпны інвэнтар таксама ёсьць, за выключэньнем 7 дыскавых барон, якія яшчэ ня прысланы з Харкава.

Як на недапушчальнае зьявішча трэба адзначыць, што трактары працуюць з няпоўнай нагрузкай — усяго 12 гадзін у суткі. Прычына гэтаму — недахоп трактарыстых. Усяго ў саўгасе 60 трактарыстых, патрэбна-ж — 120.

Гэтымі днямі мясцовыя трактарныя курсы выпусьцілі 27 новых трактарыстых і 1-га мая будзе выпушчана яшчэ зе трактарыстых. Тады гэты недахоп будзе папоўнены. Зараз трактары пераходзяць на работу ў лаўе зьмены, а з 1-га мая пяройдуць і на бесьперапынку.

Але-ж мы пытаемся: ці нельга было своячасова паклапаціцца аб падрыхтоўцы патрэбнае колькасьці трактарыстых.

Трэба зараз-жа ўжыць рашучыя меры для забясьпячэньня саўгасу патрэбнай колькасьцю ўгнаеньня. Ні ў якім разе мы не павінны дапусьціць, каб саўгас недавыканаў свайго пляну сяўбы.

***

Саўгас імя 10-гідзьдзя БССР разьвівае малочную жывёлагадоўлю. Зараз у саўгасе 600 кароў і 150 цялят і ён ужо цяпер забясьпечвае ня толькі сваіх рабочых малочнымі прадуктамі, але і здае кожны месяц Бабруйскаму ЦРК ад 30 да 50 пудоў масла і інш.

Яравы клін не адведзены

У Дучкаўскім сельсавеце, Мсьціслаўскага раёну, дасюль яшчэ ня скончана зямляўпарадкаваньне. Ні для калгасу, ні для індывідуальнага сэктару не адведзены яравы клін. Сялянам, якія выступілі з калгасу, дасюль ня вернута абагуленага ў іх насеньня. Мясцовая парт'ячэйка і сельсавет нічога ня робяць у галіне падрыхтоўкі да сяўбы і пачатку палявых работ.

БЯЛОЎ.

Трывожныя весткі з саўгасу „Слабада“

Патрэбны тэрміновыя меры

МАЗЫР, (Па тэлеграфу ад нашага карэспандэнта).

Засеўная кампанія ў саўгасе «Слабада» (Капінкавіцкі раён) знаходзіцца пад пагрозай зрыву. ПЛЯН СЯЎБЫ ЗАЦЬВЕРДЖАНЫ ТОЛЬКІ 7 КРАСАВІКА. З 87 коняй, якія ёсьць у саўгасе, на полі працуе толькі 50, рэшта занята на іншых работах. Прысланыя ў саўгас тры трактары зношаны, не працуюць. Для таго, каб узараць 1.200 гэктараў коньмі, патрабуецца 60 дзён.

САЎГАС МАЕ ТОЛЬКІ 30 ПРОЦ. ПАТРЭБНАГА ЯМУ НАСЕНЬНЯ. Нарады Белсельтрэсту Бабруйскай, Віцебскай і Менскай акругамі аб адгрузцы насеньня для саўгасу—ня выконваюцца. Не хапае с.-г. машын. Рад с.-г. машын патрабуе рамонту. Трэба прыняць тэрміновыя захады.

ВАПЕЛЬНІК.

АД РЭДАКЦЫІ: Зьмяшчаючы трывожныя весткі аб ходзе сяўбы ў саўгасе «Слабада», мы чакаем тэрміновага адказу Белсельтрэсту аб тым, што ім зроблена для дапамогі саўгасу і зжыцьця ўсіх выяўленых недахопаў.

ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЭКТАРЫ

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА НА ПАЛЁХ

8-га красавіка калгас імя Варашылава, Брагінскага раёну, вышаў у поле. У першы-ж дзень палявых работ калгасьнікі **разгарнулі сапраўднае сацыялістычнае спаборніцтва паміж аратымі. Замест вызначанай нормы ў 34 гэкт. у першы дзень было ўзарана 36 гэкт.** Калгасьнікі скардзяцца, што брыгадзіры даваляюць ім толькі выконваць норму.

У першы-ж дзень 8 гаспадароў, якія выйшлі з калгасу, падалі заявы аб прыняцьці іх зноў у калгас. У калгасе адчуваецца нястача грубога корму.

Суседні саўгас **штодзённа дапамагае калгасу, перадае яму свой вопыт у арганізацыі працы і гаспадаркі. Машыны саўгасу працуюць на калгасных палёх. Паміж калгасам і саўгасам заключаны дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва.**

Калгас з свайго боку **дапамагае бадзяцкім гаспадарам,** якія не ўвайшлі ў калгас, каб яны своячасова засялі сваю зямлю. Калгас не райшоў на 9-ціпольны севазварот.

Калгас імя Варашылава па сваёй тэрыторыі і ліку калгасьнікаў зьяўляецца другім у раёне. Трэба яго забясьпечыць адпаведнымі кіраўнікамі і паставіць на належную вышыню рахункаводзтва.

Пароцкі.

Пашыраем пасеўную плошчу

Калгас «Пралетарская Перамога», Новасёлкаўскага сельсавету, Барысаўскага раёну, рашыў пашырыць засеўную плошчу за кошт распрацоўкі няўдобных зямель, раскарчоўкі зямлі з-пад лесу і інш. Калгасьнікі і калгасьніцы разьдзімку брыгада калгасьнікаў за работай.

Калгас „Пабудка“—прыклад для іншых

Калгас «Пабудка», Лапіцкага сельсавету, зьяўляецца **самым моцным** у Асіпавіцкім раёне. Арганізаваўся гэты калгас ня так даўно ў польскай вёсцы Ўборкі. За кароткі тэрмін ён ужо мае значныя гаспадарчыя дасягненьні. Калгас добра і своячасова падрыхтаваўся да сяўбы. Усё насеньне ачышчана, с.-г. інвэнтар адрамантаваны поўнасьцю. Цягавай сілай калгас забясьпечаны. Коні ў калгасе абагулены і маюць добры выгляд, бо на працягу месяца да пачатку сяўбы атрымлівалі ўзмоцнены харч. Усе калгасьнікі надзелены на брыгады, за работу якіх адказваюць вылучаныя старшыні. Кожная брыгада добра азнаёмлена з тым, што ёй патрэбна рабіць на працягу ўсяе пасеўнае кампаніі. Арганізаваны 8-га красавіка пробны выезд у поле паказаў, што калгас зусім падрыхтаваны да палявых работ. Зараз у калгасе палявыя работы ў самым разгары. Ужо ўзарана 45 гэктараў, забаранавана 5 гэкт. Вызначаны плянам яравы клін у 148 гэктараў будзе калгасам засеяны ў тэрмін. Пасьля засеву свайго яравога кліну калгас мяркуе дапамагчы суседнему яўрэйскаму калгасу «Прагрэс», які адчувае нястачу цягавай сілы.

Калгас першым у раёне перайшоў на новы статут с.-г. арцелі. Абагуленая жывёла мае лепшы догляд, чым раней у паасобных гаспадарках. Зоаміні мум у калгасе выкананы поўнасьцю.

Гэтых посьпехаў калгас дасягнуў таму, што арганізаваная ў ім група беднаты добра і энэргічна разгортвае сваю работу. Усю сваю ўвагу група беднаты накіравала на ўзмацненьне калгасу, на арганізацыю працы, на выкарыстоўваньне ўсяе рабочае сілы калгасу. Група беднаты стварыла моцнае батрацка-бядняцкае ядро і згуртавала наўкола сябе актывістых-сераднякоў, якія маюць уплыў на ўсю работу калгасу.

Калгасы Асіпавіцкага раёну, раўняйцеся па калгасе «Пабудка».

Брыгадзір «Зьвязды» АПЯКІН.

Перагібы працягваюцца

(Мазырская акруга)

Дапушчаныя пры калектывізацыі перагібы ў радзе месц акругі працягваюцца і зараз. У вёсцы Яшнае, Якімавіцкага сельсавету, Каліпкавіцкага раёну, усім беднякам і сераднякам, якія не ўвайшлі ў калгас, адвялі зямлю вельмі невыгодную і нядзатную да сяўбы. Многія зусім не прыступаюць да сяўбы, бо лічаць, што пасеў на гэтай глебе загіне.

У выніку такога зямляўпарадкаваньня, некаторыя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі запісваюцца ў калгасы, таму што няма куды дзецца.

Такі «мэтад» калектывізацыі нічога добрага ня дасьць, бо ў азначаных мясцох сяляне ўваходзяць у калгас напаволі, а ня добраахвотна. Зусім зразумела, што такі калгасьнік карысьці калгасу не прынясе.

Акрамя таго, сялянам, якія вышлі з калгасу, не варочаюць корму, што таксама тармозіць ход палявых работ у індывідуальным сэктары.

Трэба рашуча ўдарыць па гэтаму спосабу прымусовай калектывізацыі, які выяўляецца ў адводзе нежадаючым увайсьці ў калгас зусім няпрыгоднай зямлі.

З усіх канцоў Мазырскай акругі наступаюць весткі аб тым, што плян пашырэньня пасеўнае плошчы не даведзены да асобнага двара і па сёньнешні дзень РВК і сельсаветы нічога не зрабілі ў гэтых адносінах.

Непаразуменьні маюць месца пры зборце насеньня тым сялянам, якія вышлі з калгасаў. У часе абагуленьня насеньне прымалася бяз усякай вагі — бочкамі, а зараз ім выдаюць паводле вагі, прычым за ачыстку ўтрымліваюць 25 проц.

І. В.

ЯШЧЭ АДЗІН ШКОДНЫ ПЛЯКАТ

ЧАКАЕМ АДКАЗУ НАРКАМЗЕМУ

У «Зьвязьдзе» ўжо паведамлялася пра пісьменны шкодны плякат аб пратручваньні насеньня, які быў выданы НКЗ БССР і ледзь не разасланы на месцы. Дзякуючы ўмяшальнасьці газэты гэта было ўнікнута. Навуковыя і дасьледчыя даныя сьцьвярджаюць правільнасьць нашых заўваг. Наркамзем БССР своячасова выправіў шкодны па сутнасьці плякат.

Але творчасьць Аршанскага акрэва прымушае нас зноў вярнуцца да гэтай справы. Аршанскі акрэз, які нядаўна таксама выдаў плякат аб пратручваньні насеньня ў колькасьці 5.000 экз., выпрадзіў НКЗ. У плякаце НКЗ раілася трымаць насеньне ў растворы фармаліну **7—10 мінут,** Аршанскі-ж акрэз **раіць трымаць насеньне 10—15 мінут.** Акрамя таго, у плякаце Аршанскага акрэва раіцца спосаб праграваньня насеньня, які нават яшчэ ня вывучаны ў лябараторыях. Калі прытрымлівацца парад, якія дае ў плякаце Аршанскі акрэз, **дык гаспадарка БССР атрымала-б вялікую шкоду, бо замест праграваньня насеньня атрымаецца заграваньне яго.**

Прыведзеныя вышэй факты сьведчаць аб тым, што справа арганізацыі барацьбы са шкоднікамі сельскае гаспадаркі ў БССР і кіраўніцтва ёю знаходзіцца ў бяспрытульным становішчы.

Мы патрабуем тэрміновага расьсьледваньня гэтай справы і прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

ДАРАШКІН і КЕСАРАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: Мы зварачаемся з запытаньнем да НКЗ аб выніках расьсьледваньня нашай заметкі адносна выданага ім плякату, а таксама аб творчасьці Аршанскага акрэва.

Калгасы—на дапамогу індывідуальнікам

Калгасцэнтр прапанаваў усім мясцовым саюзам, у мэтах усямернай садзейнасьці пашырэньню плошчы пасеву індывідуальных гаспадарак, арганізаваць непасрэдную дапамогу калгасаў маламоцным гаспадаркам у справе выкананьня імі пляну сяўбы.

Дапамога павінна аказвацца інвэнтаром, цягавай сілаю, ачысткай збожжа, рамонтам, садзейнасьцю ў сэнсе давядзеньня плянавых заданьняў да кожнага двара.

Няправільны адвод яравога кліну

Учора ў рэдакцыю «Зьвязды» зьявілася дэлегацыя сялян вёскі Мацкі, Астрашыцка-Гарадзецкага раёну, са скаргаю на няправільны адвод ім яравога кліну. Дэлегацыя заявіла, што ў калгас вёскі Мацкі ўвайшло ўсяго 7 гаспадарак, 67-жа гаспадарак гэтай вёскі не ўвайшлі ў калектыў. Пры зямляўпарадкаваньні калгасу над яравы клін апошняга былі адведзены **ўсе гароды і сядзібы некалгасьнікаў.**

Для расьсьледваньня гэтага факту, па просьбе рэдакцыі «Зьвязды», на месца выяжджае спэцыяльная камісія акрэва.

Зьнішчыць ПАРУШЭНЬНІ выбарчага законадаўства

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

Выбарчае законадаўства Саюзу ССР і БССР мае на мэце пазбаўленьне выбарчага права непрацоўных, эксплёататарскіх і іншых элемэнтаў, паказаных у арт. 71 Канстытуцыі БССР.

Ня гледзячы на гэта, мясцовыя органы ўлады парушаюць выбарчае законадаўства Саюзу ССР і БССР і дапускаюць практыку пазбаўленьня выбарчага права тых грамадзян, якія не належаць да пералічаных вышэй катэгорый і ўжываюць да іх розныя абмежаваньні, не чакаючы нават канчатковага вырашэньня скаргаў на няправільнае пазбаўленьне выбарчага права.

Для зьнішчэньня адзначаных парушэньняў выбарчага законадаўства і паводле пастановы Прэзыдыуму ЦВК Саюзу ССР за 22 сакавіка 1930 г. («Известия ЦИК Союза ССР и ВЦИК» № 81, от 23 марта 1930 г.), Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Запрапанаваць усім саветам, выканаўчым камітэтам і выбарчым камісіям, пры складаньні сьпісаў выбаршчыкаў і сьпісаў асоб, якія пазбаўлены выбарчага права, карыстацца выключна выбарчым законадаўствам Саюзу ССР і БССР (інструкцыя аб выбарах у саветы ВЦВК, зацьверджаная Прэзыдыумам ЦВК СССР 28 верасьня 1926 г., Збор законаў СССР за 1926 г. № 66, арт. 501, інструкцыя аб выбарах у саветы БССР, зацьверджаная Прэзыдыумам ЦВК БССР 26 лістапада 1927 году і тлумачэньні па асобных артыкулаў інструкцый, прынятыя Прэзыдыумам ЦВК Саюзу ССР і БССР), не дапушчаючы ніякіх адступленьняў ад гэтага законадаўства.

У пэрыяд падрыхтоўкі і правядзеньня выбараў у саветы складаньне сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчага права, робіцца выключна выбарчымі камісіямі і гэтыя сьпісы публікуюцца толькі пасьля зацьверджаньня іх: у сельскіх мясцовасьцях—раённымі выканаўчымі камітэтамі, а ў гарадох—гарадзкімі і раённымі саветамі па належнасьці. У пэрыяд наміж выбарчымі кампаніямі ўнясьненьне ў сьпісы асоб пазбаўленых выбарчага права (на суду і адміністрацыйна-высланых органамі АДПУ) робіцца ў сельскіх мясцовасьцях—раённымі выканаўчымі камітэтамі, а ў гарадох—гарадзкімі і раённымі саветамі па належнасьці, аб чым тэрмінова паведамляюцца зацікаўленыя асобы.

Апроч паказаных у гэтым артыкуле органаў, ніякія іншыя арганізацыі (фабзаўкомы, мясцкомы, домакіраўніцтвы, калгасы, брыгады і г. д.) ня маюць права пазбаўляць грамадзян якіх-бы там ні было катэгорый выбарчых праў.

2. Даручыць усім саветам, выканаўчым камітэтам і выбарчым камісіям пры разглядзе скарг на няправільнае пазбаўленьне выбарчага права у дакладнасьці прытрымлівацца тэрмінаў для разгляду, вызначаных у 48-50 арт. арт. інструкцыі аб выбарах у саветы БССР тым, каб кожная скарга зьнізу да верху была разгледжана ня больш, як у 2 месяцы.

3. Забараніць усім органам савецкай улады і грамадзкім арганізацыям прыстасоўваць якія-б там ні было абмежаваньні, апроч абмежаваньня права ўдзелу ў выбарах, да тых асоб, якія падалі скаргі на няправільнае пазбаўленьне іх выбарчага права, да канчатковага вырашэньня гэтых скарг ва ўсіх інстанцыях—да Прэзыдыуму ЦВК БССР уключна.

4. Запрапанаваць народным камісарыятам, усім цэнтральным установам і арганізацыям і каапэрацыйным цэнтрам, усім саветам і выканаўчым камітэтам у дзесяцідзённы тэрмін скасаваць усе пастановы, цыркуляры і загады, якія ўстанаўляюць якія-небудзь дадатковыя абмежаваньні, устаноўленыя толькі па аднаны пазбаўленьня выбарчага права і не прадугледжаныя законадаўствам Саюзу ССР і БССР у адносінах асоб, пазбаўленых выбарчага права і членаў іх сем'яў, як-та: высяленьне з кватэр, гарадоў, сельскіх і іншых мясцовасьцяй, пазбаўленьне заборных кніжак, пазбаўленьне медычнай і юрыдычнай дапамогі, адмова ў прыёме і выдачы даведак, выключэньне дзяцей са школ, выключэньне з членаў прамысловых арцеляй, раскулачваньне, абкладаньне ў індывідуальным парадку падаткамі і зборамі, пазбаўленьне права забудоўлі, муніцыпалізацыя будынкаў і г. д.

5. Запрапанаваць усім акруговым і раённым выканаўчым камітэтам для праверкі сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчага права, стварыць спэцыяльныя акруговыя (на чале з членам прэзыдыуму АВК) і раённыя (на чале з прадстаўніком АВК па вызначэньні апошняга) камісіі.

Спэцыяльныя камісіі павінны праверыць на мясцох (у гарадох, мястэчках, рабочых пасёлках, сельскіх мясцовасьцях) сьпісы і ў сувязі з гэтым скаргі і заявы асоб, пазбаўленых выбарчага права.

6. Спэцыяльныя камісіі абавязаны ў кожным паасобным выпадку праверыць правільнасьць пазбаўленьня выбарчага права тых або іншых асоб, згодна выбарчага законадаўства і ў паасобку ўстанавіць, ці абгрунтавана пазбаўленьне выбарчага права дакумантальнымі данымі, прадугледжанымі ў арт. 41 Інструкцыі аб выбарах у саветы БССР за 27 лістапада 1927 года.

7. У выпадку выяўленьня няправільнага і неабгрунтаванага ўнясьненьня паасобных грамадзян у сьпісы асоб, пазбаўленых выбарчага права, спэцыяльныя камісіі абавязаны такіх асоб выключаць са сьпісаў і тым самым аднавіць у выбарчых правах, даводзячы аб гэтым да ведама адпаведнага савету або выканаўчага камітэту для тэрміновага паведамленьня апошнімі зацікаўленых грамадзян. Калі гэтымі грамадзянамі пастанова аб пазбаўленьні іх выбарчага права раней абскаржана, паведамленьне павінна быць паслана таксама і тэй інстанцыі, па разглядзе якой у гэты час знаходзіцца скарга. Пасьля атрыманьня гэтага паведамленьня справа ў адпаведнай інстанцыі спыняецца.

У тых выпадках, калі спэцыяльныя камісіі па разглядзе скарг на пазбаўленьне выбарчага права ня знойдуць магчымым аднавіць у правох грамадзян, паказаныя скаргі з усімі матар' яламі па справе павінны быць зараз-жа ва ўстаноўленым парадку накіраваны на разгляд адпаведных вышэйстаячых выканаўчых камітэтаў.

8. Аднавіць у выбарчых правох і зараз-жа выключыць з сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчага права, усіх дасягнуўшых поўналецьця пасьля 1924 году членаў сем'яў асоб, пазбаўленых выбарчага права, калі яны ўнесены ў гэтыя сьпісы толькі таму, што ў мінулым знаходзіліся на ўтрыманьні асоб, пазбаўленых выбарчага права, і калі зараз займаюцца самастойнай грамадзка-карыснай працай, хоць і жывуць разам з гэтымі асобамі або, жывучы асобна, знаходзяцца на ўтрыманьні асоб, якія карыстаюцца выбарчым правам.

З ліку членаў сем'яў асоб, пазбаўленых выбарчага права, не падлягаюць пазбаўленьню гэтага права маючыя сродкі існаваньня выключна ад самастойнай грамадзка-карыснай працы і не знаходзяцца ў матар

Абвастрэньне клясавых баёў у краёх капіталу

Масавыя арышты ў Заходняй Беларусі

ВІЛЬНЯ, 18. У сувязі з набліжэньнем міжнароднага пралетарскага сьвята—Першага Мая—дэфэнзыва праводзіць па ўсёй Польшчы і асабліва ў Заходняй Беларусі масавыя вобыскі і арышты для таго, каб параліжаваць выступленьні рабочых у гэты дзень.

За апошнія дні віленская дэфэнзыва правяла масавыя арышты сярод віленскіх рабочых і дзеячаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Паводле папярэдніх даных арыштавана больш за 70 чалавек.

Віленскі фашысцкі друк пашырае правакацыйныя чуткі аб нейкіх таемных „выспаньніках з Менску", якія падтрымліваюць сувязь з Беларускім рабоча-сялянскім клюбам. Гэта правакацыя мае мэтай падрыхтоўку разгрому арганізацый беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

КРЫВАВЫЯ БАІ НА ВУЛІЦАХ БУДАПЭШТУ

ВЕНА, 18. Учора ў Будапэшце на акраінах гораду адбыліся новыя дэманстрацыі беспрацоўных, якія прывялі ў адным пункце да крывавых баёў. Перад біржаю працы ў поўдзень сабралася некалькі сот дэманстрантаў. Адзін беспрацоўны, стомлены голадам, зьбіты паліцэйскімі, самлеў. Паліцыя зьбівала пратэставаўных рабочых. Беспрацоўны каменщык Юліюс Ховешы выхваціў у паліцэйскага шашку і нанёс яму некалькі ўдараў. У адказ на гэта паліцэйскі пяжка параніў Ховеша з рэвальвэру ў чэрэп, лёгкія і жывот, пасьля чаго схаваўся ў адным магазыне. Дэманстранты, лічба якіх узрасла да 2.000, адцясьнілі паліцэйскіх і акружылі магазын. Былі выкліканы вялікія паліцэйскія падмацаваньні; паліцэйскія з голымі шашкамі кінуліся на дэманстрантаў і пасьля доўгага бою адцясьнілі іх у бакавыя вуліцы. Прытым некалькі чалавек было паранена. Сутычкі працягваліся больш 3-х гадзін.

У той-жа час іншыя беспрацоўныя наладзілі дэманстрацыі ў цэнтры гораду. У поўдзень беспрацоўныя групамі накіраваліся на набережную Дунаю—месца прагулак буржуазнай публікі. Конная і пешая паліцыя разагнала дэманстрантаў. У прамысловым прыгарадзе Кішпэшце некалькі сот беспрацоўных дэманстравалі перад ратушай, патрабуючы работы і хлеба. У пралетарскім прадмесьці Будапэшту—Пэштэр'це учора распаўсюджваліся і расклейваліся лістоўкі кампартыі і камсамолу, якія заклікаюць рабочых да чырвонай першамайскай дэманстрацыі.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ РАБОЧЫХ У ГАМБУРГУ

БЭРЛІН, 17. У Гамбургу адбыўся сход камітэту барацьбы з забаронаю чырвонага саюзу франтавікоў. На сход напала паліцыя. Арыштавана 287 чалавек, у тым ліку 22 жанчыны. У часе адказу арыштаваных за іх уступіліся рабочыя, якія наладзілі дэманстрацыю салідарнасьці.

У Магдэбургу адбылася сутычка паміж сходам беспрацоўных і паліцыяй, якая прабавала разагнаць сход. Двое беспрацоўных арыштаваны. Некалькі паранена.

КАНЧАТКОВАЕ ПЕРАРАДЖЭНЬНЕ ПРАФСАЮЗНАЙ БЮРАКРАТЫІ

БЭРЛІН, 18. Першамайская адозва цэнтральнага камітэту рэфармісцкіх прафсаюзаў у Нямеччыне ў яскравай форме падкрэсьлівае канчатковае пераражэньне прафсаюзнай бюракратыі. Адозва ставіць на чале ўсяго «эканамічную барацьбу за гаспадарчую дэмакратыю» і ні адным словам не ўспамінае аб барцьбе за сацыялізм і аб гістарычным значэньні майскага дня. Характэрна, што адозва нічога не гаворыць ні аб барацьбе супроць ураду буржуазнага блёку, ні аб забастоўцы першага мая, ні нават аб дэманстрацыях.

АМЭРЫКАНСКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ—НА ПЕРШАМАЙСКІЯ ЎРАЧЫСТАСЬЦІ Ў СССР

НЬЮ-ЁРК, 17. Сёньня ў СССР выяжджаюць 12 рабочых і сялянскіх дэпутатаў, якія адпраўляюцца па ініцыятыве таварыства Друзей СССР для ўдзелу ў першамайскіх урачыстасьцях у СССР. (ТАСС).

КАТАРЖНЫЯ ПРЫСУДЫ НАД РАБОЧЫМІ Ў ЯПОНІІ

ТОКІЁ, 17. Адбыліся судовыя працэсы асоб, арыштаваных 16 красавіка 1929 г. па абвінавачаньні іх у камуністычнай дзейнасьці. У Асоры 9 чалавек прыгавораны да турэмнага зьняволеньня ад 2-х да 7 год. У Акіта — 6 чалавек прыгавораны да зьняволеньня на тэрмін ад 2-х да 8 год. Пракурор суда ў Екагаме, лічачы вынесены прысуд вельмі мяккім, абскарджыў яго.

РЭПРЭСІІ СУПРОЦЬ РАБОЧАГА ДРУКУ Ў ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 16. У сувязі з набліжэньнем 1-га мая ўзмацніліся рэпрэсіі супроць рабочага друку. Апэляцыйны суд зацьвердзіў пастанову папрачага суду, які прыгаварыў былога рэдактара «Юманіте» Мішэ да 2-х год турмы і 2.000 франкаў штрафу за надрукаваньне антываеннага артыкулу.

РЭПРЭСІІ СУПРОЦЬ КАМУНІСТЫХ У ЛІТВЕ

КОЎНА, 18. Паводле паведамленьня «Летувос Айдас», коўенскі камэндант накладаў штраф у разьмерах 3.000 літаў з заменаю ў выпадку няўплаты 3-хмесячным турэмным зьняволеньнем на 12 асоб, якія падазраваюцца ў прыналежнасьці да кампартыі. Штраф накладзены «за пашкоджаньне аднае часткі насельніцтва на другую».

ПАДРЫХТОЎКА ДА 1-ГА МАЯ ПАД ІДЭЯЛЕГІЧНЫМ КІРАЎНІЦТВАМ КАМПАРТЫІ

ЛЁНДАН, 10. Падрыхтаваньні да 1-га мая ў Англіі ідуць поўным ходам. Асноўным у правядзеньні сьвяткаваньня зьявіцца дэманстрацыя, якая наладжваецца на традыцыі ў Гайд-парку. У дэманстрацыі прымуць удзел атрады галоднага паходу, якія да таго часу прыбудуць у Лёндан. **Рэфармістыя адмакілі назначаную імі на той-жа дзень дэманстрацыю.**

Камітэт па правядзеньні дня 1-га мая працуе пад ідэалёгічным кіраўніцтвам кампартыі, якая высунула лёзунгі: «Барацьба супроць сацыял-фашызму, імпэрыялістычнага лейбарыстскага ўраду і яго памочнікаў Мэкстона, Броквэй і К-о» (незалежная рабочая партыя), «На барацьбу за незалежнасьць калёніяй», «Вызвалце мірцкіх вязьняў», «За абарону Савецкага Саюзу».

ЗА МАСАВУЮ ПАЛІТЫЧНУЮ ЗАБАСТОЎКУ Ў ДЗЕНЬ 1-га МАЯ

ВЭРЛІН, 18. Выданы загад аб канфіскацыі на ўсім краі камуністычнай газэты-адыднёўкі, прысьвечанай першамайскай кампаніі. Ня гледзячы на праведзеныя ва ўсіх гарадох вобыскі, у большасьці выпадкаў газэту канфіскаваць не ўдалося. Цэнтрам першамайскай кампаніі зьяўляецца прапаганда палітычнай масавай забастоўкі ў дзень 1-га мая. Камуністычны лёзунг «Выбірайце мясцовыя камітэты на заводах, прафсаюзах і біржах працы». На многіх прадпрыемствах і заводах ужо прагалавана пастанова не працаваць 1-га мая.

Назначэньне кітайскіх консулаў у Чыту і Хабараўск

ШАНХАЙ, 17. Паводле паведамленьня агэнцтва «Гомінь», Гуан Чан-цін назначаны консулем у Хабараўск, а Дзінкуан консулем у Чыту.

1-га МАЯ АДКРЫВАЕЦЦА ТУРКСІБ

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму Камітэту Садзейнасьці па пабудове Туркестана-Сібірскай магістралі, якое адбылося пад старшынством тав. **Т. Р. Рыскулава**, разглядалася пытаньне аб парадку правядзеньня ўрачыстасьці ў сувязі з надыходзячым адкрыцьцем Турксібу.

1-га мая г.г. адбудзецца змычка паўночнага і паўднёвага вучастка Турксібу. З гэтага часу на новай чыгунцы адкрыецца рух па ўсёй лініі.

Такім чынам, Турксіб канчаецца пабудовай на год раней таго, як меркавалася плянам.

ШТО ДАСЬЦЬ ТУРКСІБ

Дзяржплян СССР для 1930-31 году арыентыравана вызначае наступную колькасьць масавых грузаў, якія падлягаюць перавозцы па Турксібе. **Мяркуецца перавезьці 680.000 тон хлеба, у тым ліку 280.000 тон з Сібіры і 400.000 тон з раёнаў Турксібу, 1.200 тыс. тон песаматар'ялаў, 50 тыс. тон мяса, 100 тыс. тон дрывянога топліва і 900 тыс. тон** іншых грузаў. Колькасьць зваротных грузаў па Турксібу на 1930-31 год арыентыравана вызначаецца ў разьмеры 500.000 тон (вугаль, нафта і інш.), што складае каля 25 проц. ад усяго колькасьці масавых грузаў з боку Сібіры. У 1930-31 г. па Турксібу мяркуецца перавезьці да 1.200 тыс. пасажыраў.

У мэтах разьвіцьця сеткі пад'язьдных шляхоў да Турксібу мяркуецца прыняць цэлы рад мерапрыемстваў, у прыватнасьці **закончыць да 1-га кастрычніка бягучага году пабукову чыгункі Фрунзэ-Токмак** і працягваць работы па яе давядзеньні да Рыбачага з такім разьлікам, каб усе работы па пабудове гэтае веткі былі закончаны да 1-га студзеня.

На навукова-дасьледчыя работы, зьвязаныя з пачаткам эксплёатацыі Турксібу, паміма ўжо адпушчаных па каштарысах розных ведамстваў 4.720 тыс. руб. мяркуецца адпусьціць дадаткова з рэзэрвнага фонду СНК СССР 181.700 рублёў.

ПРАВЫ УХІЛ—ГАЛОЎНАЯ НЕБЯСЬПЕКА

Бязьлітасна выкрываючы правых апартуністых, узмацніць барацьбу з „левымі" загібшчыкамі, якія зьяўляюцца аб'ектыўна саюзьнікамі правых ухілістых

ПАБАЛЬШАВІЦКУ ЎДАРЫЦЬ ПА ТЫХ, ХТО НЕ ЖАДАЕ ВЫПРАЎЛЯЦЬ СВАІХ ПАМЫЛАК

Імкнуцца апраўдаць свае банкруцтва

Кіраўнікі Расонскага раёну цьвёрда парашылі не адставаць у сваёй рабоце па калгасным будаўніцтве ад перадавых раёнаў суцэльнай калектывізацыі. Ня трацячы часу, раённыя работнікі энэргічна прыняліся за ажыцьцяўленьне сваіх плянаў па калектывізацыі Расоншчыны. Практычнае выкананьне гэтых плянаў праводзілася шпарка і рашуча.

Раённыя работнікі ня лічылі патрэбным правесьці адпаведную агітацыйна-растлумачальную і арганізатарскую работу сярод батрацтва і бядняцка-серадняцкіх мас. Расонскія калектывізатары лічылі, што для таго, каб правесьці суцэльную калектывізацыю ў раёне, даволі адпаведных дырэктыўных цыркуляраў і афіцыйных пастаноў. Абвясьціць Расонскі раён адразу раёнам суцэльнай калектывізацыі ў мясцовых работнікаў не хапіла сьмеласьці. Занадта была ўжо відавочна поўная непадрыхтаванасьць Расонскага раёну да суцэльнае калектывізацыі. Калгасы налічваліся адзінкамі. Асноўная маса сялянства амаль нічога ня ведала аб сутнасьці калектывізацыі. Але, у раёне быў знойдзены выхад. Мясцовыя калектывізатары пайшлі на манэўр. Яны абвясьцілі рад сельсаветаў сельсаветамі суцэльнае калектывізацыі. Праўда, у гэтых сельсаветах калектывізавалася плошча ледзь дасягала 10 проц.ч, але ў раёне лічыцца, што, «калі сельсаветы абвешчаны сельсаветамі суцэльнае калектывізацыі, дык значыць яны цалкам калектывізаваны».

За гэтымі пастановамі аб абвяшчэньні сельсаветаў сельсаветамі суцэльнае калектывізацыі наступіла сыстэма агідных перагібаў і скажэньняў партыйнай лініі. Мясцовыя работнікі палец аб палец ня стукнулі, каб правесьці хаця-б якую-небудзь растлумачальную работу. Замест гэтага яны, у большасьці выпадкаў, займаліся адміністраваньнем і камандаваньнем. Беднаце і серадняцтву, якія не жадалі ўступіць у калгасы, гаварылася: «ваш сельсавет усё роўна зьяўляецца сельсаветам суцэльнае калектывізацыі. Калі вы ня ўступіце ў калгас, дык прыдзецца вас выселіць».

У раёне былі складзены два спэцыяльныя сьпісы №№ 1 і 2. Кожны бядняк і серадняк павінен быў абавязкова даць свой подпіс у той ці іншы сьпіс. У першы сьпіс заносіліся ўсе тыя, хто ўступаў у калгасы, у другі—хто на якіх-небудзь прычынах адмаўляўся. Усім бедняком і серадняком, запісаным у сьпіс № 2, заяўлялася:—«Вы абавязкова будзеце выселены».

Такім спосабам мясцовым работнікам удалося за некалькі дзён калектывізаваць рад сельсаветаў амаль на ўсе 100 проц. Многія сельсаветы (**Продаўскі, Кляськіцкі** і інш.) за 2-3 дні былі калектывізаваны на 90 проц. Рад іншых сельсаветаў 2-3 дні былі калектывізаваны з 8-10 проц. да 90-100 проц.

Адміністраваньне з боку асобных ячэек даходзіла да таго, што яны ня толькі не прыцягнулі да работы па калектывізацыі беднату і серадняку, а нават... забаранілі прымаць у гэтай рабоце камсамольскім ячэйкам. Звычайна гэтыя ячэйкі лічылі, што «камсамольцам нельга давяраць работу па калектывізацыі».

У раёне ў радзе месц махровая правааапартуністычная практыка цесна перапляталася з «левымі» перагібамі.

Частка камуністых, «раскулачваючы» серадняку, прыхільна адносіліся да кулаку. У раёне раскулачаны дзесяткі серадняцкіх гаспадарак, былі выпадкі, калі «раскулачваліся» чырвоныя партызаны. У той-жа час «спрытныя калектывізатары» чамусьці «не заўважылі» кулацкіх гаспадарак. Гэта не выпадкова. У расонскіх работнікаў кулак карыстаўся пашанай. Кулакі ня ўнесьлі ў свой час с.-г. падатку на суму звыш 9.000 руб. Гэтыя грошы не спагнаны і да гэтага часу. У раёне пічога ня было зроблена, каб паціснуць на кулака.

Як выразны прыклад праваапартуністычнай практыкі ў Расонскай арганізацыі трэба адзначыць амаль поўную адсутнасьць усялякае работы сярод батрацтва і беднаты. Значная частка ячэек яўна недаацэньвае работы сярод батрацка-бядняцкіх мас і груба ігнаруе дырэктывы партыі па гэтым пытаньні. Зусім ня дзіва, што ў пераважнай большасьці калгасаў яшчэ ня створаны батрацка-бядняцкія групы. Тыя-ж групы, якія ўжо арганізаваны, фактычна зусі не працуюць. Партыйныя ячэйкі, як правіла, ня цікавяцца работай батрацка-бядняцкіх груп у калгасах.

Дапушчаныя перагібы і скажэньні партыйнай лініі выпраўляюцца злачынна марудным тэмпам. Раённае партакіраўніцтва, трэба проста сказаць, упарта не жадае выпраўляць дапушчаных памылак. Сакратар райкому разам з членам бюро РК Руткоўскім усялякімі спосабамі імкнуцца замазаць і апраўдаць перагібы і скрыўленьні, меўшыя месца ў раёне. Самакрытыка ў Расоншчыне заціснута. Многія партыйцы проста заяўляюць, што яны баяцца выступаць з крытыкай.

Паказальна, што нават тады, калі сакратару райкому падаюць канкрэтныя прыклады перагібаў і скажэньняў, дык ён усё роўна катэгарычна не жадае прызнаваць дапушчаных памылак. Сакратар РК, напрыклад, ня лічыць такія факты, як прымусовае абагуленьне маемасьці, арганізацыя калгасу пад нагрозай аброі і г. д. перагібамі і скрыўленьнямі.

***

Становішча Расонскай партарганізацыі заслугоўвае самае сур'ёзнае ўвагі. Трэба рашуча аздаравіць партыйнае кіраўніцтва раёну, якое змазвае дапушчаныя перагібы і скрыўленьні і ўпарта не жадае выпраўляць сваіх памылак.

Х—н.

Перагібы выправім

Нядаўна адбыўся раённы сход Крупскай парт'арганізацыі. Сход абмеркаваў даклад аб папярэдніх выкіках калгаснага будаўніцтва ў раёне і аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Ва ўхваленай рэзалюцыі сход канстатуе, што ў раёне дапушчаны грубыя перагібы і скрыўленьні дырэктыў партыі па калгасным будаўніцтве. Замест работы з батрацтвам і бядняцка-серадняцкімі масамі ў радзе сельсаветаў былі дапушчаны адміністраваньне, камандаваньне, практыка прымусу і запалохваньня і г. д., і т. п. Адміністраваньне даходзіла да таго, што некаторыя работнікі арыштоўвалі беднякоў і сераднякоў, якія не жадалі ўступіць у калгасы.

Райпартсход цалкам і поўнасьцю прызнаў і рашуча асудзіў дапушчаныя раённай партарганізацыяй праваапартуністычныя памылкі і «левыя» перагібы пры правядзеньні калектывізацыі. Сход запрапанаваў РК прыцягнуць да суровай адказнасьці тых камуністых, якія скажалі лінію партыі і зараз не жадаюць прызнаваць і выпраўляць сваіх памылак. У прыватнасьці, райпартсход запрапанаваў райкому тэрмінова вырашыць пытаньне аб партыйнасьці камуністых **Яцука і Шостака**, якія дапусьцілі абураючыя скажэньні і перагібы. 7 чалавек за грубейшыя скажэньні лініі партыі выключаны ўжо з КП(б)Б.

У сваёй рэзалюцыі раённы партсход завастрыў увагу ўсіх ячэек безадкладна да канца ліквідаваць дапушчаныя перагібы і памылкі і разгарнуць самую шырокую прапрацоўку і папулярызацыю пастаноў ЦК УсеКП(б) і артыкулаў тав. Сталіна.

Пастанова ПК ЦКК КП(б)Б

Аб тэрміне сканчэньня праверкі і чысткі радоў КП(б)Б

У выкананьне пастаноў Прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) аб сканчэньні чысткі да 1-га мая г. г. парткалегія ЦКК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абавязаць усе акруговыя кантрольныя камісіі разам з вучастамі акругкомаў безадкладна праверыць і ўстанавіць на сваіх акругах дакладны лік членаў і кандыдатаў партыі, якія па розных прычынах не прайшлі праверкі, і весткі аб іх паведаміць ЦКК КП(б)Б да 25 красавіка г. г.

2. Выходзячы з пастаноў Прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б), усім АКК скласьці па сваіх акругах каляндарны плян праверкі непрайшоўшых па розных прычынах чысткі. Работу гэту праводзіць такім парадкам, каб праверка азначанай часткі партыйцаў была скончана ці ў якім разе не пазьней 1-га мая г. г. і весткі аб іх былі дасланы ЦКК КП(б)Б 20-га мая г. г.

3. Тэрмін і парадак праверкі непрайшоўшых па розных прычынах чысткі членаў і кандыдатаў партыі абвясьціць у друку (Менскай АКК у цэнтральных газэтах, рэшце АКК — у акруговых газэтах). Разам з гэтым усім АКК асобным лістом разэ ячэйкі папярэдзіць усіх непрайшоўшых па розных прычынах праверкі, што ў выпадку незьяўленьня на праверку да 1-га мая, або непаведамленьня партыйным камітэтам, або кантрольным камісіям па месцы знаходжаньня аб прычынах немагчымасьці зьявіцца на праверку да 1-га мая, — яны будуць лічыцца мэханічна выбыўшымі з партыі.

4. На ўсіх членаў і кандыдатаў партыі, якія да 1-га мая г. г. ня пройдуць праверкі і не паведамяць аб прычынах немагчымасьці зьявіцца на праверку, АКК скласьці сьпіс аб гэтых т. т. і праз ячэйкі адабраць ад іх партдакументы. Сьпісы па асобных акругах з паказаньнем прычын аб адмаўленьні прайсьці праверку, даслаць у ЦКК КП(б)Б не пазьней 10-га мая з тым, каб іх можна было скласьці па ўсёй КП(б)Б і своячасова паведаміць ЦКК УсеКП(б).

5. Разам з гэтым ПК ЦКК КП(б)Б прапануе ўсім АКК паскорыць разгляд апэляцый. Работу гэту праводзіць такім парадкам, каб яна была скончана да канца красавіка г. г. Вынікі разгляду апэляцый распрацаваць па ўстаноўленых формах з дачай аналізу па некаторых ячэйках, і даслаць іх у ЦК КП(б)Б не пазьней 5-га мая г. г.

6. Маючы на ўвазе, што ёсьць выпадкі парушэньня праверкомамі § 37 інструкцыі па чысткі, згодна якога ў выключаных пры праверцы павінны адбірацца партбілеты або кандыдацкія карткі — прапанаваць АКК тэрмінова арганізаваць і правесьці праверку, ці былі выпадкі несадабраньня ў выключаных пры чысткі партыі білетаў і кандыдацкіх картак і прыняць меры да адабраньня іх. У выпадку немагчымасьці адабраць партбілеты і кандыдацкія карткі абвясьціць у друку аб несапраўднасьці гэтых дакумантаў.

Вынікі праверкі паведаміць ЦКК КП(б)Б не пазьней 5-га мая г. г.

Калі пачнецца рэалізацыя пазыкі „Пяцігодка—у чатыры гады"

МАСКВА, 13. Рэалізацыя пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады» пачнецца ў ліпені бягучага году. У горадзе падпісная кампанія скончыцца да 1-га кастрычніка, а ў вёсцы да 1-га лістапада. Растэрміноўка па калектыўнай падпісцы даецца на 10 месяцаў, па індывідуальнай—на 3 месяцы. Першы ўзнос на аблігацыі, якія будуць набывацца па калектыўнай падпісцы, праводзіцца з зарплаты за другую палову ліпеня. Сярод калгасьнікаў падпіска будзе праводзіцца на тых жа умовах, што і сярод арганізаваных працоўных у горадзе. Пры ўсіх калгасах арганізуюцца камісіі садзейнічаньня. Усе разьлікі з калгаснікамі па падпісцы праводзяцца праз праўленьне калгасу.

Падпіска сярод сялян-індывідуальнікаў будзе праводзіцца выключна за наліччныя. Усяго ў 1930-31 годзе пазыка «Пяцігодка ў чатыры гады» намячаецца рэалізаваць на 750 млн. руб., з іх 500 млн. сярод рабочых і служачых, 200 млн. сярод сялянства і 50 млн. сярод неарганізаванага гарадзкога насельніцтва.

Жалобны вечар, прысьвечаны памяці Маякоўскага

17-га красавіка ў «Доме пісьменьніка» адбыўся жалобны вечар, прысьвечаны памяці Ўладзімера Маякоўскага. На вечары прысутнічала шмат пісьменьнікаў, артыстых, мастакоў, студэнтаў, вучняў.

З дакладам аб літаратурнай дзейнасьці Ў. Маякоўскага выступіла дацэнт БДУ тав. Гальпэрына. Паэта Кляшторны прачытаў апошні твор Маякоўскага «Во весь голос»—пераведзены ім на беларускую мову.

Памёр вядомы мастак А. Я. Галовін

ЛЕНІНГРАД. 17 красавіка пасьля цяжкай хваробы памёр вядомы мастак Галовін. З імем Галовіна зьвязана эпоха росквіту дэкарацыйнага малярства, якому мастак прысьвяціў 38 год. Галовін стварыў у гэтай галіне шмат арыгінальных шэдэўраў. У мінулым годзе Галовіну была надана годнасьць народнага артыстага Рэспублікі.

НОВЫЯ МЕСЦАНАРАДЖЭНЬНІ НІКЕЛЕВЫХ РУД

ЛЕНІНГРАД, 15. У раёне ст. Хапіпава, у Арэнбурскай акрузе, выкрыты тры месцанараджэньні руд. Запас руд дасягае 32 млн. тон. Процант чыстага нікелю ў іх роўны 10. Месцанараджэньні бясспрэчна носяць прамысловы характар.

Аб новай памылцы тав. Чарвякова

Прызнаньне і выпраўленьне палітычных памылак, дапушчаных паасобнымі членам партыя заўсёды лічыла такой-жа прынцыповай справай, як і барацьбу з самымі гэтымі памылкамі.

Барацьба з памылкамі і ўхіламі ад гэнэральнае лініі партыі ёсьць, перш за ўсё, справа бальшавіцкай мабілізацыі партыйных і беспартыйных мас на ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнага будаўніцтва. Вось чаму партыя крытыкуе памылкі сваіх асобных членаў, зусім адкрыта перад масамі.

Дзякуючы гэтай адкрытай і жорсткай бальшавіцкай крытыцы палітычных памылак, непрымірымай барацьбе на два фронты, як з правым, найбольш небясьпечным на даным этапе ухілам, так і з «левымі» загібамі, што ўзбройваюць правых,—партыя павышае сваю бальшавіцкую баяздольнасьць і аўтарытэт сярод самых шырокіх рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас.

Так імена партыя паставіла пытаньне і аб памылцы т. Чарвякова, якую ён дапусьціў пядаўна ў сваёй рабоце на калектывізацыі ў Сьмілавіцкім раёне. Гэта памылка т. Чарвякова вывялася па сходзе партканактыву швэйнай фабрыкі «Кастрычнік». Актыву Менскай партарганізацыі, на якім выступаў т. Чарвякоў, гэта памылка ўжо вядома і асуджана партактывам. Але, паколькі справа ідзе аб лініі партыі ў калектывізацыі, аб пасьпяховай барацьбе з правымі і «левымі» апартуністымі, паколькі цяперашняя памылка т. Чарвякова зьвязана з яго ранейшымі памылкамі, мы павінны давесьці яе да ведама ўсёй партыі. Тым больш, што няправільнае выступленьне т. Чарвякова ў Сьмілавіцкім раёне мае дэзарыентаваць мясцовых партыйных працаўнікоў і арганізацыю.

У чым-жа палітычная сутнасьць памылкі т. Чарвякова? Яна ў тым, што т. Чарвякоў няправільна зразумеў і няправільна тлумачыў сходу беднаты і сераднякоў установу партыі аб добраахвотнасьці ў калектывізацыі. Калі тав. Чарвякову на сходзе было пастаўлена запытаньне: «Абавязкова, ці не, ісьці ў калгас», т. Чарвякоў даў такое тлумачэньне на запытаньне, што дазволіў сабе правесьці паралель у разуменьні добраахвотнасьці паміж уступленьнем ў калгас і прызывам у Чырвоную армію. Прычым т. Чарвякоў з свайго параўнаньня зрабіў такі вывад: «Адным словам, гэта служба (у Чырвонай армії) добраахвотная, але папрабуйце не пайсьці ў Чырвоную армію, вас прымусяць».

Зусім відавочна, што падобнае тлумачэньне зьяўляецца грубым няправільным і не адпавядае тым тлумачэньням, якія давала партыя ў сваіх шматлікіх дырэктывах і ў апошніх артыкулах т. Сталіна.

Вось палітычная сутнасьць памылкі т. Чарвякова. Зусім ясна, што мала толькі канстатаваць яе, трэба паказаць, дзе прычыны памылкі т. Чарвякова. На гэта трэба адказаць, што апошняя памылка т. Чарвякова стаіць у сувязі з яго ранейшымі памылкамі ў разуменьні генэральнай лініі партыі, у прыватнасьці, у калгасным руху. Тады ў поглядах тав. Чарвякова адчувалася праваапартуністычнае няверʼе ў посьпехі калектывізацыі, недаацэнка клясавай барацьбы ў вёсцы. Тав. Чарвякоў у выніку крытыкі партыі прызнаў тады свае памылкі, выступіўшы з артыкулам у «Зьвязьдзе». Аднак, апошня памылка т. Чарвякова гаворыць аб тым, што ён на досыць глыбока прадумаў і самакрытыкаваў свае няправільныя погляды. Інакш нельга растлумачыць таго, што ў сваіх апошніх выступленьнях у Сьмілавіцкім раёне і на парткалектыве ф-кі «Кастрычнік» т. Чарвякоў выявіў новыя памылкі ў пытаньнях калектывізацыі. Вышэйпаданае тлумачэньне т. Чарвякоўм установукі партыі на добраахвотнасьць у калектывізацыі яскрава паказвае, што ім яшчэ ня зжыта нявер'е і няўпэўненасьць у здольнасьці партыі пасьпяхова разгортваць калгасны рух на падставе актыўнасьці саміх бядняцка-серадняцкіх мас. Сваёй апошняй памылкай тав. Чарвякоў паказвае, што ён яшчэ і зараз недаацэньвае ўзмацненьня саюзу рабочае клясы і беднаты з серадняком па падставе посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва, не ўяўляе ўзростшай актыўнасьці беднаты і батрацтва ў барацьбе з кулаком за калектывізацыю. Адсюль вынікае тое, што ён сваё тлумачэньне добраахвотнасьці калектывізацыі фактычна зводзіць да напоўпрымусовых мерапрыемстваў, забываючы тую партыйную ісьціну, што ня толькі беднота, але і серадняк масаю пайшоў у калгас.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі рэзка адсудзіў выступленьне тав. Чарвякова. Фрунзаўскі райком Менскай арганізацыі ў сваёй рэзалюцыі паказвае на тое, што выступленьне Чарвякова не выпадкова, што яго выступленьне цесна зьвязана з яго ранейшымі памылкамі. Газэта «Голас Шэйніка», крытыкуючы памылку т. Чарвякова, між іншым, зусім правільна таварыць, што «партыя будзе рашуча біць, не зважаючы на асобы, па ўсіх тых, хто паспрабуе ўжываць апартуністычныя вопыты над ленінскай лініяй партыі ў калектывізацыі».

У сваім выступленьні на партактыве Менскай арганізацыі і ў лісьце ў газэту «Голас Шэйніка» тав. Чарвякоў прызнаў сваю памылку, асудзіўшы сваюе пробу абараніць яе на сходзе парткалектыву фабрыкі «Кастрычнік», дзе партыйцы жорстка крытыкавалі гэту памылку тав. Чарвякова.

Жорсткая крытыка з боку партыйных арганізацый дапаможа т. Чарвякову ня толькі прызнаць дапушчаныя памылкі, але і на справе паказаць, што ён іх выпраўляе. Партыйная арганізацыя чакае ад т. Чарвякова доваду шчырасьці яго заяў на практыцы штодзённай работы.

Узмацнім партыйнае кіраўніцтва ячэйкамі Асоавіяхіму

Мабілізуем увагу грамадзкасьці на задачах узмацненьня абароны краіны

Ці ёсьць падставы для работы Асоавіяхіму на Добрускай фабрыцы

Цікава пазнаёміцца з працай Асоавіяхіму на Добрускай фабрыцы «Гэрой Працы».

Што высьветліла пры абсьледваньні бюро брыгада?

На працягу свайго існаваньня пасяджэньняў бюро было 8, а агульных сходаў членаў Асоавіяхіму ня было зусім.

Падліку членаў Асоавіяхіму зусім не вялося. На запытаньне брыгады ў старшыні ячэйкі тав. БАРЗЕНКАВА—«Колькі ў вас членаў»—ён адказаў—«ня ведаю».

На запытаньне, чаму ня было рэвізіі на працягу 2-х год, старшыня рэвізійнай камісіі адказаў: «Ня было часу і зараз я таксама ня маю магчымасьці рабіць рэвізію—рабеце самі».

Працай Асоавіяхіму ня цікавіліся ні фабком, ні райком, гэта сьведчыць аб тым, што за ўвесь час не заслуханы даклады аб працы ячэйкі Асоавіяхіму.

Кампанія па распаўсюджаньні білетаў 4 авіялётарэі нават не разгортвалася, адсюль няма ніякага сумненьня ў тым, што з вялікаю сілаю распаўсюджана 300 білетаў і больш (як кажуць члены бюро) «ХОЦЬ ПАМРЫ, НІЧОГА НЯ ЗРОБІШ».

Інструктар акрсавету ГАРБУНОЎ, якому трэба было дапамагчы ў рабоце ячэйкі, пагаствяваў на фабрыцы, нічога не зрабіў, пацікавіўся і паехаў у Гомель.

У засеўнай кампаніі ячэйка зусім ня прымала ніякага ўдзелу ў той час, калі магчымасьць ва ўмовах Добрушу ёсьць вялікая.

ЗАРАЗ ПАБАЧЫМ, ШТО ЗРАБІЛА БРЫГАДА НА ПРАЦЯГУ 4-х ДЗЁН І ЦІ ЁСЬЦЬ ПАДСТАВА ДЛЯ ПРАЦЫ АСОАВІЯХІМУ НА ДОБРУСКАЙ ФАБРЫЦЫ.

Бюро ячэйкі і рэвізійную камісію брыгада пастанавіла распусьціць. Членаў бюро і рэвізійнай камісіі за іх «актыўную» работу прыцягнуць да адказнасьці.

Брыгада арганізавала 5 цэхавых ячэек і 4 пры прафесыянальных і каапэратыўных арганізацыях і падрыхтавала справу да выбараў райсавету.

Правяла мітынгі на цэхах, на якіх галоўным чынам ставілася пытаньне аб «крыжовым паходзе» і рэалізацыі лётбілетаў і, як вынік гэтай працы, трэба адзначыць, што з 1.000 білетаў не засталося піводнага.

Такім чынам, ёсьць падставы для працы ў Добрушы.

Трэба адзначыць, што пасьля выбару райсавету ў Добрушы, пры тым энтузіязьме рабочых, які праявіла брыгада, справа Асоавіяхіму і, галоўным чынам, ваенная падрыхтоўка палепшылася, а тым, хто нядбайна адносіўся да працы, райком і фабком дадуць належную ўзнагароду.

БАРАНОЎСКІ.

Пачалі працаваць

У Рагачоўскім райсавеце Асоавіяхіму ня было ніякай работы. Пасьля перавыбараў райсавету асоавіяхімаўская работа значна палепшылася.

Ужо праведзены стралковыя спаборніцтвы, у якіх прымала ўдзел 17 гарадзкіх і 2 вясковыя ячэйкі Асоавіяхіму і спаборнічала каля 200 чалавек. Раду таварышоў былі выданы прызы, дробнакаліберныя вінтоўкі, процігазы і гарнітуры. Жанчыны паказалі добрыя вынікі і ў страляньні не адстаюць ад мужчын.

У ячэйках таксама пачалі працаваць. Пашыраюць білеты 4-й лётарэі, ставяць спэктаклі, вырастаюць у калгасах новыя ячэйкі.

Усім вясковым ячэйкам даны дырэктывы аб удзеле іх у засеўнай кампаніі, аб арганізацыі «гектара абароны» і прапаганды ўжываньня мінэральных угнаеньняў.

Абсталёўваецца летні цір, будуецца галубіная станцыя, але да гэтага часу яшчэ ненармальная сувязь з акрсаветам Асоавіяхіму. Да гэтага часу акрсавет не дагаварыўся з акрэа, ад адводу паказальнага поля Рагачоўскай арганізацыі Асоавіяхіму, а час не чакае. Акрсавет патрабуе прысылкі вестак аб рэалізацыі лётарэйных білетаў па форме № 4, а формы ня прыслаў.

Трэба ўсе ненармальнасьці зьнішыць і даць магчымасьць умацаваецца рабоце Рагачоўскага райсавету Асоавіяхіму.

МЭЙЦІН.

Ячэйка НКЗ ня кіруе вайсковай работай

Ня гледзячы на тое, што ў вайсковы гурток НКЗ запісаліся амаль усе супрацоўнікі ўстаноўы, гуртка фактычна няма. Партыйная ячэйка НКЗ абмежавалася толькі вылучэньнем кіраўніка гуртка—і на гэтым уся работа парт'ячэйкі скончылася.

Вылучаны кіраўнік гуртка амаль увесь час у камандыроўках, без кіраўніка гурток не працуе. Заняткі павінны быць тры разы ў месяц, а на справе—за ўвесь час бягучага году былі праведзены заняткі толькі два разы. Наведваньне гуртка кепскае: зьявілася на заняткі толькі 35 проц. супрацоўнікаў і толькі 40 проц. партыйцаў. Тлумачаць яны гэта тым, што «камандыроўкі не даюць магчымасьці наведваць гурток».

Ап. М

Ноччу на „Чырвонай Бярэзіне“

Абураючае зьніжэньне працдысцыпліны

Сотні гадзін страчанага рабочага часу

Дырэктар тав. Альфіровіч лічыць, што адміністрацыя „нічога ня можа зрабіць“

Рэдакцыя газэты «Зьвязда» разам з рабкораўскай брыгадай «Зьвязды» і групай лёгкай кавалерыі фабрык «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская Перамога», пры ўдзеле прадстаўніка газэты «Рабочай», поччу з 16-га на 17-га красавіка зрабілі «налёт» на работу начное зьмены гэтых фабрык.

У выніку палёту высьветлілася, што машыны і варштаты не загружаны поўнасьцю, ёсьць выпадкі, калі рабочы кідае работу раней гудка і калі пачынае працаваць чарговая зьмена— пя ўсе рабочыя пачынаюць працаваць адразу-ж. У адным толькі ўпаковачным цэху у адной зьмене, кінулі працу раней гудка ад 15 мінут і да гадзіны **97 чалавек.** Па другой зьмене «Чырвонай Бярэзіны» вышлі раней гудка **139 чалавек.** У фанэрным цэху «Чырвонай Бярэзіны» работу кідаюць за 45 мінут да гудка. Рабочыя, якія працуюць на істужкавай і абрэзачнай піле, кінулі работу **на 1 гадз. 10 мінут раней тэрміну.** «Норму зрабілі і хопіць» — кажуць яны. У шчапальным цэху за 30 мінут да гудка 50 проц. рабочых кінулі работу, а за 15 мінут да гудка ў цэху ўжо нікога ня было. У ватэрпасным цэху 50 проц. варштатаў, а таксама ліфельшчыцы і праўшчыцы, у колькасьці 10 чал., працавалі толькі **4 гадзіны** з прычыны адсутнасьці сухога дубу.

Сушка дубу не прыстасавана да ўмоў працы і кіраўніцтва заводу ня прыняло ніякіх мер да зьнішчэньня прастояў з гэтае прычыны.

На фабрыцы «Пралетарская Перамога» — **50 проц. абсталяваньня не скарыстоўваецца.** Работу кідаюць раней гудка па 15-20 мінут. У другой зьмене пайшлі раней часу **33 чалавекі.** Пры пачатку работы трэцяй зьмены ў скрыпачным цэху толькі 8 машынак пачалі працаваць сваячасова, а рэшта каля 25-30 машынак)—праз 15-20 хвілін пасьля гудка. У вэтыкеровачным цэху 9 машынак пачалі працаваць сваячасова, рэшта (каля 15)— на 10-15 мінут пасьля тэрміну. У скрыпачным цэху 15 работніц у працягу **гадзіны** ня мелі работы.

У цэхах адсутнічае выстарчальная распарадчасьць загадчыкаў цэхамі. Па цэхах ходзяць без работы дзесяткі чалавек, якія перашкаджаюць сваім таварышом працаваць. Загадчык цэхамі не зварачае ніякае ўвагі, хто ходзіць па цэхах, не правярае прапускоў у той час, калі ходзяць **не рабочыя фабрыкі.**

Ахова фабрыкі пастаўлена **вельмі дрэнна.** На тэрыторыю фабрыкі праходзяць усе, хто хоча. А 2-й гадзіне ночы брыгадзіры абышлі ўсю тэрыторыю фабрык асобна і групамі і ніхто іх не затрымаў і не праверыў прапускоў. На некаторых вучастках тэрыторыі фабрыкі **адсутнічалі міліцэйскія пасты.** Паставы № 2 **сядзеў у качагарцы.** На электра-станцыі, дзе ідзе яшчэ ўстаноўка двух катлоў і аднэй турбіны, у кацельнае і разьмеркавальнае аддзяленьні брыгадзіры прайшлі і ніхто не запытаўся пропуску. Калі пра ўсё гэта расказалі дырэктару фабрыкі т. **Альфіровічу,** ён адказаў: «Так усё правільна, мы гэта ведаем, **але нічога ня можам зрабіць»** (?!).

Трэба прыняць тэрміновыя меры да зьнішчэньня недахопаў.

Удзельнікі налёту—
КАВАЛЕЎ, НЕЗАКОНАЎ, САЛАВЕЙЧЫК, ТАЛАРАЙ, НЭДЛІН І ФАЛЬКО.

Прастоі па віне адміністрацыі

Нядбайныя адносіны дырэктара т. Альфіровіча

Фабрыка «Пралетарская Перамога» пачала праводзіць прыстасаваньне машын і варштатаў да вырабу экспарту. Адміністрацыя фабрыкі не прыняла патрэбных мер. каб прыстасаваньне да экспарту не адбілася на нармальнай рабоце фабрыкі.

Пачалі прыстасоўваць чатыры шыберных машынкі і не забясьпечылі сябе шыбэрам. У выніку чаго 17 красавіка у дзённай зьмене фабрыка прастаяла ДЗЬВЕ ГАДЗІНЫ а ў другой зьмене 2½ ГАДЗ. у той час, калі прастой можна было зьнішчыць пускам скрыначнага цэху ў нядзелю (фабрыка яшчэ не працуе на бесьперапынцы) і поўнай нагрузкай шыбэрных машын на старой фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна». У другой і трэцяй зьмене старой фабрыкі 50 проц. шыбэрных машын не працуюць.

Дырэктар фабрыкі Альфіровіч на пытаньне, чаму прастоі, заявіў: «што-ж, стаяць... А калі трэ' будзе — будуць стаяць».

Неабходна прыняць тэрміновыя меры.
Я. ФАЛЬКО.

З лістоў рабселькораў

ПАЖАРНІКІ НЕ НА СВАІМ МЕСЦЫ

Гэтымі днямі ў **Дуброўне** (Аршанчына) узьнік вялікі пажар. Згарэлі два дамы больніцы, склад з сенам мачной фэрмы і цэлы рад прыватных дамоў. Для ліквідацыі пажару прыехала праз... 2 гадзіны пажарная каманда без багроў і вады. Пажарныя машыны з-за непасаванасьці не працавалі. Начальнік дружыны **Бярнозаў** на пажар зьявіўся праз тры гадзіны тады, як прыехала Аршанская і Асінбудаўская пажарныя дружыны. Разам з гэтым гарадзкая пажарная дружына ня мела хамутоў для запрагання коняй. Прычыны нядбайных адносін начальніка і пажарнікаў гарыць дзяржаўная маемасьць.

Належныя арганізацыі павінны з гэтага зрабіць адпаведныя вывады.
П. Б.

НЕ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА СЯЎБЫ

Сельска - гаспадарчы тэхнікум (**Барысаўшчына**) не падрыхтаваўся да яўбы. Насеньне не ачышчана, машыны наіржавелі і не рамантуюцца. Там, зе засеяна жыта, будуецца вялікі сьвінарнік, які займае каля 2 гэкт. зямлі. Загадчык фэрмы Крытончык бегае, але нічога ня робіць. З-за галавацяпства адміністрацыі гінуць сотні рублёў.

РСІ гэтым пытаньням павінна зацікавіцца.
ДК.

«ВЫЛУЧЭНЬНЕ» КАГАНА

Гомельскі сампрамсаюз праводзіў працы ўхіл на практыцы. Старшыня крэдытна - прамысловага банку, былы сакратар парт'ячэйкі **Каган** праводзіў яўна кулацкую лінію. Ён забясьпечваў дэфіцытнымі таварамі, як падешвай, мануфактурай, бяхай не бяднейшых сатужнікаў, а заможных, набор якіх даходзіў да 6-7 тысяч руб. У выніку заможныя саматужнікі пабудавалі сабе дамы. Больш таго, у некаторых саматужнікаў акрэма знайшло па 3 тоны бляхі

Зараз кулацкі прыхільнік Каган займае пасаду заг. аргаддзелу Гомельскага сампрамсаюзу.

Органы РСІ павінны гэтым «начальнікам» зацікавіцца.
З. Ш.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ НА ХЛЕБНЫМ СКЛАДЗЕ

Хлебны склад млыну **«Адраджэньне»** (Менск) знаходзіцца ў безгаспадарчым стане. Раней жыта ляжала ў складзе, дзе ня было вакон, у выніку жыта «атакоўвалі» галубы і інш. птушкі. Гэты дэфэкт быў зьнішчаны. Пасьля другога абсьледваньня высьветліўся цэлы рад іншых дэфэктаў: вокны ў складзе забіты наглуха, падлога з дзіркамі. Над падлогай знаходзіцца шмат жыта. Ёсьць цэлы рад і іншых недахопаў, якія трэба хутчэй зьнішчыць.

БРЫГАДЗІР.

НЕНАРМАЛЬНАСЬЦЬ НА ГОРНЫХ КУРСАХ

Пры ВСНГБ працуюць двухгадовыя горна - керамічныя курсы. Курсанты забясьпечаны дрэнна: адсутнічае інтэрнат, не выдаюцца льготныя абеды і білеты ў **лазьню. На пражыцьцё не хапае стыпэндыі.**

Умовы вучобы і работы дрэнныя, не закуплена патрэбная літаратура і падручнікі. **Заняткі** праходзяць у зусім цесным памяшканьні, пры дрэнным сьвятле, пасьля трэцяй зьмены. Часта зрываюцца заняткі, а адміністрацыя курсаў ня прымае ніякіх мер.

Прафком і пралетстуд умовамі жыцьця курсантаў і іх вучобай ня цікавяцца. Пара падумацца, каму належыць, над гэтым пытаньнем
МАЛЧАНАЎ І ЦІХАДУМ.

За калгасы, за бальшавіцкую сяўбу

Калгас імя Леніна быў ужо амаль арганізаваны: у яго ўступіла каля 75 гаспадароў, быў абагулен сельска - гаспадарчы інвэнтар. Не абагульваліся коні. Прычынаю гэтаму, як высьветлілася пазьней, быў поп з Халяўчыны (Астрашыцка - Гарадзецкі раён), які пры дапамозе кулацтва разваліў калгас.

Калі набожныя калгасьнікі з калгасу імя Леніна (в. Каралёў-Стан, Калодзішчанскага сельсавету) запрасілі папа ў сваю капліцу на набажэнства, поп Паўскі адмовіўся паехаць у Каралёў-Стан таму, што там арганізаваны калгас.

Гэту акалічнасьць, а таксама і некаторыя памылкі праўленьня калгасу вельмі спрытна скарысталі мясцовыя кулакі для агітацыі супроць калгасу.

Беднята суседніх калгасаў «Бальшавік» і «Дружба» на сходах выказалася за матар'яльную дапамогу калгасу імя Леніна.

14-га красавіка раніцою, а 5 гадзіне, калектывы «Бальшавіка» і «Дружбы» ў поўным складзе сабраліся і вышлі на дапамогу калгасу імя Леніна. 150 фурманак з рознымі сельска - гаспадарчымі машынамі зрабілі сваю справу: 75 гэктараў зямлі калгасу імя Леніна за некалькі гадзін дружнай працы былі заараны і забаранаваны. Некаторыя сяляне, якія раней, пад уплывам папоўска - кулацкай агітацыі, пакінулі калгас, цяпер вярнуліся зноў у калгас і пачалі працаваць разам з калектывамі «Бальшавіка» і «Дружбы».

Уп. СЕМ.

ЧЫСТКА АПАРАТУ ВСНГБ

ТАВ. ШЭЎЧАНКА НЕ СЬПЯШАЕЦЦА

Узоры бюракратызму і цяганіны групы гарбарнай прамысловасьці

Налёт на сталы і партфэлі асобных працаўнікоў ВСНГ паказаў, што далёка ня ўсе спэцыялісты ахоплены энтузіязмам рабочай клясы на ажыцьцяўленьні пяцігодкі і задач, якія стаяць па выкананьні прамфінпляну 29-30 г.

Налёт паказаў, што, напрыклад, група гарбарнай прамысловасьці не змагла пераключыцца на новыя рэйкі працы, што нядбайныя і бюракратычныя адносіны да сваіх абавязкаў застаюцца і на сёнешні дзень.

Аб гэтым сьведчаць наступныя факты.

28-II 30 г. Клімавіцкі райкалгассаюз запытаў ВСНГ БССР аб парадку пераарганізацыі калгасамі сырамяці.

3-III адносьнік перададены інжынэру тав. Шэўчанка для адказу. Аднак, **да апошняга часу** нічога ня зроблена, хоць тав. Шэўчанка сам адзначае важнасьць хуткага вырашэньня гэтага пытаньня для калгасаў.

15-II 30 г. Скуртрэст адносьнікам за № 1—3 прасіў ВСНГ БССР аб дадатковым уключэньні ў прамфінплян на 29-30 г. 600.000 руб., неабходных для пабудовы на Магілеўскай абутковай фабрыцы аб'яднанай з Магілеўскай фабрыкай штучнага валакна парасілавой станцыі, водаправоду і каналізацыі.

Ня гледзячы на ўсю важнасьць закрэпутага пытаньня, апошняе дакладваецца інжынэрам Шэўчанка нам. старшыні ВСНГ БССР тав. Баскабойнікаву толькі **18-III 30 г.,** які, не ўясьніўшы сутнасьці пытаньня, прасіў заключэньня зводнапляновай групы. Апошняя да гэтага часу ня можа дабіцца ад тав. Шэўчанка пэўнага адказу па сутнасьці пытаньня і пытаньне ўвесь час ляжыць бяз руху.

23-X 29 г. Дзірижплян прапанаваў ВСНГ БССР у месячны тэрмін апрацаваць пытаньне аб бліжэйшых пэрспэктывах рэканструкцыі гарбарна - абутковай прамысловасьці ў БССР.

Прапанова выконваецца толькі пры пераглядзе 5-цігодкі, якая ў новым варыянце адаслана 7-III 30 г.

7-XII 29 г. разгледжан новы варыянт пяцігодкі гарбарна - абутковай прамысловасьці БССР, але матар'ялы канчаткова апрацаваны і разасланы толькі 7-III 30 г.

23-XII 29 г. ВСНГ СССР просіць паведаміць яму, як ужываецца Скуртрэстам уведзеньня з 1-X 29 г. новыя стандарты па гарбарнай прамысловасьці. Усё-ж патрэбныя весткі не пасланы.

Справаздачы па капітальным будаўніцтве за 28-29 г. атрыманы ад Скуртрэсту і Белпчаціны яшчэ **ў сьнежні 1929 г.,** аднак, да гэтага часу не прааналізаваны і ня зданы для канчатковага ўключэньня ў зводку. І гэта ў той час, калі партыя і ўрад увесь час зварачаюць вялікую ўвагу на пытаньні будаўніцтва.

Справаздача аб сабекошце за 1 кв. 1929-30 г. атрымана яшчэ ў лютым, але да гэтага часу не прааналізавана і заключэньне адсутнічае. Тое самае і ў адносінах справаздачы па сабекошце за **студзень** 1930 г., якая атрымана яшчэ 6-III 30 г., але ўвесь час ляжыць без руху.

І такі «халадок» ёсьць тады, калі становішча з сабекоштам па гарбарнай прамысловасьці далёка нездавальняючае, калі ёсьць пэўная пагроза ў выкананьні прамфінпляну за 29-30 г.

9-XII і 15-XII 30 г. — ВСНГ СССР (Скурпром) зварачае ўвагу ВСНГ БССР на важнасьць і сур'ёзнасьць пытаньня аб выкананьні пляну экспарту па гарбарнай прамысловасьці (мяздровы клей), у сувязі з чым пабывае вялікае значэньне зьніжэньне сабекошту заказанага клею. Пры гэтым даюцца канкрэтныя паказаньні, якім шляхам можна дабіцца зьніжэньня сабекошту апошняга

Як рэагаваў кіраўнік гарбарнай групы і інжынэр Шэўчанка на гэты артыкул?

Ажыцьцяўленьне апошняй абмяркоўваецца абгаварэньнем яе на тэхнарадзе пры Скуртрэсце ад **11-I 30 г.,** на якой сумесна з інж. тав. Шэўчанка прымаюцца агульныя пастановы, як: «прыняць меры да атрыманьня максымальнай колькасьці сала з мяздры» і г. д. без паказаньня канкрэтных мерапрыемстваў.

Пры гэтым прыкладам фармальных адносін зьяўляецца адказ ВСНГ СССР (за-XII), які па сутнасьці зьяўляецца адпіскай. Адказ запэўняе ВСНГ СССР, што экспартны плян за 1 квартал 1929-1930 г. будзе выкананы, але канкрэтныя мерапрыемствы, якія забясьпечваюць такое выкананьне, не паказваюцца. Характэрна пры гэтым, што калькуляцыя сабекошту мяздровага клею, якую ў паказаным адказе ад 23-XII 29 г. гарбарная група абяцае прадставіць праз 7 дзён, ёю да гэтага часу не пасланa. У самым-жа ВСНГ БССР адсутнічаюць усялякія весткі аб фактычным выкананьні паказанай дырэктывы па экспарце клею, і прэзыдыуму гэтае пытаньне не дакладваецца і перад апошнім не асьвятляецца.

ЦК КП(б)Б: рабочы абутковай фабрыкі КУНЦЭВІЧ, машыністы Брыгадзіры — вылучэнцы курсаў чыгункі ст. Полацак АНДРЭЕЎ.

Дырэктыву аб адзіначальлі—у масы

НА ФАБРЫЦЫ ІМЯ КРУПСКАЙ І ЗАВОДЗЕ «БЕЛАРУСЬ» ДЫРЭКТЫВА ПАРТЫІ Ў ЖЫЦЬЦЁ НЕ ПРАВОДЗІЦЦА.—РАБОЧЫЯ І РАБОТНІЦЫ АБ ДЫРЭКТЫВЕ НЯ ВЕДАЮЦЬ.—МАЙСТРЫ АДМАЎЛЯЮЦЦА АД СВАІХ ПРАВОЎ І АБАВЯЗКАЎ

МАЙСТРЫ БЯГУЦЬ ДА ДЫРЭКТАРА

Дырэктар заводу «Беларусь» т. **Маўчан** на запытаньне, ці выразна разьмёркаваны абавязкі паміж «трыкутнікам» адказвае:

— Так, нічога сабе... Напрыклад, заўком у функцыі адміністрацыі ня ўмешваецца.

Ня прыходзіцца абвяргаць таварыша Маўчана, бо заўком ня толькі ня ўмешваецца ў функцыі адміністрацыі, ён наступ ні ў што ня ўмешваецца.

Пытаньне аб адзіначальлі было пастаўлена на агульным сходзе рабочых у студзені. Але на гэтым сходзе прысутнічалі ня ўсе рабочыя. Так яно і прайшло. Значная частка рабочых, такім чынам, нават і ня чула аб дырэктыве партыі адносна адзіначальля. Заўком-жа лічыць, што на заводзкай «Шпике все спокойно».

Качагар **Невяровіч** няўважліва адносіцца да работы. Мэханік **Рамановіч** ніяк ня можа адважыцца зрабіць заўвагу Невяровічу. Ён ня хоча быць адказным і таму бяжыць да дырэктара са скаргай і запытаньнем — што яму зрабіць з Невяровічам.

Або трэба Рамановічу атрымаць матар'ял са складу. Замест таго, каб найсьці да загадчыка складам, ён ідзе да дырэктара.

Вось пізавар тав. **Ковач.** Калі ён бачыць, што той ці іншы рабочы нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў, ён замест таго, каб гэтаму рабочаму зрабіць заўвагу, бяжыць да дырэктара і просіць —«прымеце меры».

— А самі вы ня можаце?

— Навошта, каб на мяне крыўдзіліся рабочыя?..

У цэху на вырабе зэльтарскіх вод ёсьць **майстар т. Канцпер** і старшы рабочы **Лібэрман.** Гэтыя два таварышы

ЦІ ХОПІЦЬ АДНАГО ДАКЛАДУ?

— Калі прагледзець дзённік работы фабкому шчотачнай фабрыкі імя Крупскай, можна там усё знайсьці. Аднаго толькі няма—пытаньняў аб адзіначальлі.

Хоць старшы майстар тав. Дзікштэйн стараўся давесьці, што ўсе работніцы і рабочыя добра знаёмы з пастановай ЦК аб адзіначальлі, але на першае-ж запытаньне ад першай работніцы быў чуцён адказ:

— Адзіначальле? Гэта калі фабком пастанаўляе, дык адміністрацыя—хоць трэсьні, а выканай.. Ці ня так?

І на растлумачэньне, што гэта ня так, работніца заўважыла:

— Тады значыць мы аб адзіначальлі нічога ня ведаем...

І сапраўды, ці можна азнаёміцца з такім вялікім і складаным пытаньнем, як адзіначальле, на адным сходзе, з аднаго дакладу? Апрача таго, на фабрыку за апошні час прыйшло шмат новых работніц, якія зусім не знаёмы з умовамі працы сацыялістычнага прадпрыемства, частыя выпадкі парушэньняў працдысцыпліны. І тым ня менш, нічога ня робіцца для давядзеньня пастановы ЦК **да кожнай работніцы.**

Майстры таксама не ўсьвядомілі, як належыць прыняць адзіначальля. Калі, напрыклад, работніца Сухман спазьнілася на работу, дык майстар Нісэнбаўм бяжыць да дырэктара і пытаецца—«што з гэтай работніцай зрабіць?». Або, напрыклад, трэба майстру перавесьці на другі варштат рабочага. І ў гэтым выпадку ён бяжыць да дырэктара з хадайніцтвам—«дазвольце перавесьці рабочага на іншую работу».

І трэба аднаначыць, што так робяць ужо **майстры** без выключэньня. Зразумела, што неразуменьне **нават майстрамі** дырэктывы аб адзіначальлі ў значнай меры адбіваецца на ўзмацненні працдысцыпліны сярод рабочых і работніц. Наглядаюцца выпадкі, калі асобныя рабочыя замест безадкладнага выкананьня загаду майстра, спрачаюцца мінут 20 і толькі потым бяруцца за работу.

Вытворчая камісія, як кажуць, працуе ня кепска. Прапановы рабочых, паводле слоў дырэктара, выконваюцца на 70 проц. Праўда, рабочыя пры гэтым заўважылі, што «добра было-б, каб яны выконваліся хаця-б на 50 проц.».

Але асноўны недахоп—гэта тое, што **плянавыя заданьні не даведзены да кожнага рабочага.** Праўда, фабком зьбіраецца выдаць усім рабочым на рукі гадавы прамфінплян, але гэта зразумела, зусім невыстарчальна, каб давесьці прамфінплян да кожнага рабочага. Наўрад-ці ўсе рабочыя разьбяруцца ў гадавым прамфінпляне, які, да рэчы, будзе напісаны бухгальтарскай мовай.

А. Манькоў.

Да прызыву 1908 году

Дамо Чырвонай армії патрэбнае папаўненьне

Падрыхтуем баявую зьмену

Органамі мясцовага ваеннага кіраўніцтва пачалася падрыхтоўчая работа да правядзеньня чарговага прызыву 1908 году ў Чырвоную а[illegible]

Прыпіска молада[illegible] прызыўных вучасткаў ужо скончана. [illegible]рговая работа, якая павінна быць праароблена — удакладненьне прызыўных сьпісаў і прадастаўленьне ільгот прызываным па сямейна - маемасным становішчы.

Асабліва палітычнае значэньне пры правядзеньні падрыхтоўчай работы па прызыве набывае пытаньне выяўленьня і недапушчэньня ў рады Чырвонай армії сацыяльна - чужых элемэнтаў.

Ня гледзячы на існуючыя законы аб недапушчэньні ў рады Чырвонай армії непрацоўных элемэнтаў, эпошнія ўсялякімі хітрыкамі і рознымі камбінацыямі часамі пралазяць у Чырвоную армію. Пры правядзеньні леташняга прызыву адзначаліся выпадкі, калі кулацкія і непманскія сынкі з БССР прыпісваліся да прызыўных вучасткаў у Сібіры і ў іншых далёкіх мясцох і пад выглядам батракоў пралазілі ў Чырвоную армію.

Абвастрэньне клясавай барацьбы, курс, узяты нашай партыяй на ліквідацыю кулацтва, як клясы, абавязвае партыйныя, савецкія, камсамольскія, прафэсыянальныя і грамадзкія арганізацыі, у першую чаргу асоавіяхімаўскія прыняць усе меры да недапушчэньня ў Чырвоную армію сацыяльна-чужых элемэнтаў.

Неабходна разгарнуць шырокую растлумачальную работу вакол гэтага пытаньня, прыцягнуць увагу ўсёй савецкай грамадзкасьці. Трэба прыняць рад арганізацыйных мерапрыемстваў для праверкі прызыўных сьпісаў, прыцягваючы да гэтага камсамольскія, асоавіяхімаўскія арганізацыі і саміх прызыўнікоў.

Неабходна павесьці сярод прызыўнікоў і насельніцтва шырокую растлумачальную работу аб парадку правядзеньня прызыву, аб правілах прадастаўленьня ільгот па сямейна - маемасным становішчы і аб абавязках прызыўнікоў на вайсковай службе.

Трэба з усёй выразнасьцю растлумачыць, што Чырвоная армія зьяўляецца ўзброенай сілай Савецкага Саюзу і заклікана пралетарскай дзяржавай служыць абароне яе межаў, што Чырвоная армія зьяўляецца **баявой школай** для працоўнай моладзі, а таксама і растлумачыць аб цяжкасьцях ваеннай службы.

Уся гэта работа павінна быць цесна ўвязана з растлумачэньнем міжнароднага становішча, выкрываючы антысавецкія ваенныя падрыхтаваньні імпэрыялістых.

Асобна стаіць пытаньне аб падрыхтоўцы прызыўнікоў - партыйцаў і камсамольцаў да іх службы ў Чырвонай арміі. Частка партыйцаў і камсамольцаў у першы час прабываны і ў Чырвонай арміі ня можа хутка прыстасавацца да армейскай абстаноўкі і па гэтай глебе здараюцца, праўда адзіночныя, выпадкі адыходу ад актыўнай партыйнай і камсамольскай работы.

Гэта трэба зьнішчыць.

За летні пэрыяд з партыйцамі і камсамольцамі, якія падлягаюць прызыву, неабходна правесьці рад гутарак аб асаблівасьцях работы партыйных і камсамольскіх арганізацый у Чырвонай армії, азнаёміць іх з «Палажэньнем» аб партыйных ячэйках і камсамольскіх групах.

Гэта дасьць магчымасьць партыйцам і камсамольцам неадкладна, па прыходзе ў армію, прыступіць да актыўнай работы ў армейскіх партыйных і камсамольскіх арганізацыях.

Значная частка падрыхтоўчай работы да прызыву ў гэтым годзе пераносіцца ў раён. Таму з боку партыйных арганізацый і савецкіх органаў патрабуецца неаслабленая ўвага да работы прызыўных камісій. Трэба неадкладна зьнішчаць тыя памылкі, якія могуць быць дапушчаны прызыўнымі камісіямі.

ВАСЬКОВІЧ.

Ячэйкі Асоавіяхіму, рыхтуйцеся да прызыву

Цэнтральны Савет Асоавіяхіму даў дырэктывы аб актыўным удзеле асоавіяхімаўскіх арганізацый у падрыхтоўцы і правядзеньні прызыву 1908 г.

Ячэйкам Асоавіяхіму трэба безадкладна прыняць удзел у разгортваньні шырокай агітацыйнай, растлумачальнай работы сярод прызыўнікоў і мець на ўвазе, што варожыя нам элемэнты, асабліва кулакі ў вёсцы, будуць прабаваць скарыстаць прызыў для распаўсюджаньня розных правакацыйных чутак. Гэтым спробам клясавай барацьбы, курс, узяты нашай партыяй на ліквідацыю кулацтва, як клясы, абавязвае партыйныя, савецкія, камсамольскія, прафэсыянальныя і грамадзкія арганізацыі, у першую чаргу асоавіяхімаўскія прыняць усе меры да недапушчэньня ў Чырвоную армію сацыяльна-чужых элемэнтаў.

Неабходна разгарнуць шырокую растлумачальную работу вакол гэтага пытаньня, прыцягнуць увагу ўсёй савецкай грамадзкасьці. Трэба прыняць рад арганізацыйных мерапрыемстваў для праверкі прызыўных сьпісаў, прыцягваючы да гэтага камсамольскія, асоавіяхімаўскія арганізацыі і саміх прызыўнікоў.

Неабходна павесьці сярод прызыўнікоў і насельніцтва шырокую растлумачальную работу аб парадку правядзеньня прызыву, аб правілах прадастаўленьня ільгот на сямейна - маемасным

У Чырвоную армію трэба даць граматнае і разьвітае папаўненьне. Для гэтага ячэйка Асоавіяхіму павінна разгарнуць работу па лікпункце, прымацаваць да лікпункту сваіх граматных таварышоў і да прызыву ліквідаваць іх нашэсьменнасьць.

Такім-жа шляхам можна палегчыць прызыўніком і вучобу ў Чырвонай армії, стварыўшы для іх спэцыяльныя гурткі і прапрацаваць праграму 1-й ступені гуртка байсковых ведаў.

Гэта папярэдняя падрыхтоўка прызыўнікоў да іх службы ў Чырвонай армії павінна быць, як і ўся работа па падрыхтоўцы да прызыву, праведзена на аснове ўказаньняў партыйнай ячэйкі і ўвязана з сельсаветам і камсамольскай арганізацыяй.

Асаблівую ўвагу асоавіяхімаўская грамадзкасьць павінна зьвярнуць на клясавы адбор прызыўнікоў. Шляхам азнаямленьня са сьпісамі і выкрыцьця чужых нам элемэнтаў, ячэйкі Асоавіяхіму абавязаны аказаць вялікую дапамогу прызыўным органам, каб не дапусьціць прасякненьня ў рады Чырвонай армії непралетарскіх элемэнтаў.

Наша задача даць Чырвонай армії адданае справе рабочае клясы папаўненьне з ліку рабочых, батракоў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў.

Усю гэту кампанію трэба будаваць на пачатках сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, цесна ўвязаўшы яе з папулярызацыяй ролі і задач Асоавіяхіму, уцягваючы ў рады таварыства новыя і новыя пласты працоўных.

Да зьлёту ўдарнікаў Беларускае ваеннае акругі

Гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва, якая супадае з канцом зімовай вучобы, Беларуская ваенная акруга адзначае скліканьнем першага акруговага зьлёту ўдарнікаў усіх часьцей акругі.

Перад пачаткам летняй вучобы на зьлёце будуць падагулены тыя вынікі, якія маюць часьці акругі, дасягнутыя імі на аснове шырокага размаху сацыялістычнага спаборніцтва і разгортваньня яго вышэйшай формы — ударніцтва.

Гэтае падагульваньне дае часьцям магчымасьць вызначыць далейшыя шляхі, каб у часе летняй вучобы замацаваць гэтыя посьпехі і дабівацца вялікіх посьпехаў у баявой падрыхтоўцы часьцей.

Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву палітычных органаў і партыйных арганізацый, рост ударніцтва ў часьцях праходзіў ад падразьдзяленьня да падразьдзяленьня.

Ужо ёсьць цэлыя палкі і нават дывізіі, якія абвясьцілі сябе ўдарнымі і па справе дабіліся высокага ўзроўню баявой падрыхтоўкі.

Аднак, у справе шырокага скарыстаньня практыкі ўдарнага руху яшчэ ня ўсё дасягнута. Дасягненьні адзэй часьці не стансвяцца дастаткам іншых часьцей, няма шырокага абмену практыкай, не даволі вывучаюцца і абагульваюцца новыя формы ўдарніцтва і ўдарнай работы.

Яшчэ прабел — гэта ў кіраўніцтве ўдарніцтвам з боку партыйных арганізацый. Не ва ўсіх часьцях камсамольскія групы дабіліся 100 проц. удзелу камсамольцаў ва ўдарніцтве, асабліва індывідуальным. **Яшчэ ёсьць камсамольцы і нават радавікі - партыйцы, якія не зьяўляюцца ўдарнікамі,** і гэтыя прабелы яшчэ не ліквідаваны партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі часьцей.

Вялікую дапамогу ў разьвіцьці сацспаборніцтва і ўдарніцтва аказалі нам рабочыя фабрык і заводаў, якія шэфствуюць над часьцямі. Заключаныя паміж палкамі і заводамі, батальёнамі і цэхамі дагавары на выкананьне прамфінпляну і на ўзмацненьне баявой падрыхтоўкі часьцей, узмацнілі ўплыў рабочае клясы над чырвонаармейскай масай, набліжалі іх да вытворчасьці і накладвалі пэўныя абавязацельствы, якія абодва бакі ў большасьці выконвалі.

Цяпер перад зьлётам у часьцях праводзіцца шырокая самаправерка сацспаборніцтва, якая выкрые недахопы ўдарнага руху і паставіць пад шырокую самакрытыку кіраўніцтва ўдарніцтвам у часьцях і работу саміх ударнікаў.

На аснове гэтай самаправеркі шырэй падагуліцца практыка ўдарніцтва, з большай карысьцю пройдзе работа зьлёту, які вызначыць рад практычных мерапрыемстваў для далейшага ўзмацненьня ўдарнага руху ў часьцях акругі і большага ўзмацненьня нашай баявой гатоўнасьці.

М. В.

На Бабруйскім камбінаце няма гаспадарчага вока

Дзесяткі буйных вытворчых недахопаў б'юць па прамфінпляне

Падрыхтоўка кваліфікаванай рабсілы пастаўлена зусім дрэнна

«Зьвязда» ў свой час сыгналізавала о прарывах на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. Рабочыя камбінату сьвядомілі ўсю важнасьць выкананьня прамфінпляну. Асноўны кадр рабочых устуніў у сацспаборніцтва, ва ўдарныя брыгады. У выніку за апошні мэсяц наглядаецца некаторы пералом у выкананьні колькасных паказальнікаў. Лесапільны цэх выканаў у сакавіку вытворчую праграму на 104 проц., фанэрны цэх — на 115 проц. (па першым заданьні Лесбелу). Аднак, калі прыняць ад увагу, што вялікі прэс, якому Лесбел вызначыў адноўкавае з малым рэсам заданьне ў 13 куба-мэтраў у зьмену, дае фактычна 22 куба-мэтры ў зьмену (гэту норму вызначыла яму цяперашняя кіраўніцтва камбінату), дык процант выкананьня вытворчай праграмы значна паменшыцца.

Справа з якаснымі паказальнікамі дагэтуль застаецца пагражаючай. Асабліва востра стаіць пытаньне са зьніжэньнем сабекошту. Фанэрны цэх страціў на высокім сабекошце — у студзені 4.000 руб., у лютым — каля 38.000, з іх па 20.000 руб. у месяц прыпадае на высокі сабекошт па аднэй толькі працоўцы сырцу. Сакавік месяц ня даў значных зьмен.

Нават лесапільны цэх, які ва ўсіх адносінах працуе ў значна лепшых умовах, перавысіў сабекошт за другі квартал на 6 проц. супроць пляну.

Значны ўплыў на недавыкананьне прамфінпляну аказвае вялікая колькасьць прастояў. У лесапільным цэху прастоі павялічылі сабекошт кожнага куба-мэтру на 15 кап. У фанэрным цэху за люты і сакавік было 34 прэсазьмены прастояў.

Вялікая колькасьць прастояў зьяўляецца вынікам невыстарчальнай кваліфікацыі асобных рабочых і іх няўважлівых адносін да варштатаў, вынікам адсутнасьці запасных частак і розных іншых тэхнічных непаладак.

Камбінат расьце з кожным днём. У бліжэйшы час ён пазнен прыняць каля 800 чалавек. Між тым, з укамплектаваньнем камбінату рабочай сілай, асабліва кваліфікаванай, абстаіць надта дрэнна. Фанэрны цэх павінен мець 543 рабочых, але фактычна ў лютым і сакавіку праз цэх прайшло па 1.200 чалавек (сьпісачны склад).

Да гэтага часу ня створаны ўмовы для замацаваньня рабочай сілы на камбінаце. Ёсьць выпадкі, калі той ці іншы рабочы, прапрацаваўшы дзень-два, звальняецца. Выходзіць таму, што кватэрныя ўмовы ня могуць усіх задаволіць, што грамадзкае харчаваньне ня зусім добра пастаўлена, і па іншых прычынах. Між тым, досыць было пабудаваць некалькі баракаў, каб ліквідаваць жыльлёвы крызіс. Пяць баракаў абыйшліся-б усяго ў 15.000 руб., але Лесбел марудзіць з выдачай грошай на гэту важнейшую справу.

«Зьвязда» некалькі раз пісала аб адсутнасьці запасных частак. Але дагэтуль нічога амаль ня зроблена. На варштаце № 2 фанэрнага цэху зламалася гітара, на рамонт якое было патрачана 2½ зьмены. А калі-б была запасная гітара, прастой складаў-бы ня больш поўгадзіны. Ні да аднэй рамы лесацэху няма запаснога ляфэту.

Да гэтага часу не праведзена ў жыцьцё рад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, якія вызначаны плянам, або ўнесены рабочымі. Мэханізацыя падачы бярвеньняў да парні, што павінна даць каля 35.000 руб. эканоміі ў год, ня зроблена. Лесбел марудзіць з выдачай патрэбных сродкаў, хоць ён сам зацьвердзіў пляны і чарцяжы.

Лушчынны варштат замест 40 зваротаў робіць толькі 30, што падаражае кожны куба-мэтр на 2 руб. 80 кап. Для паскарэньня работы варштату **заводу «Энэргія»** яшчэ ў сьнежні 1929 г. былі заказаны пяць шасьцерняў, але **завод «Энэргія» да гэтага часу іх не зрабіў.** Завод «Энэргія» таксама ня выканаў яшчэ заказу камбінату на часткі для канвэеру па падачы адкідаў, адсутнасьць якога таксама навышае кошт куба-мэтра на 2 руб.

На камбінаце не х

БЕЛАРУСКАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ АДСТАЕ

ад тэмпаў рэканструкцыі сельскай гаспадаркі

ЗАВОДЫ С.-Г. МАШЫНАБУДАЎНІЦТВА ПАВІННЫ НАМДАВАЦЬ БУЙНЫЯ МАШЫНЫ І ПРЫЛАДЫ

Калектывізацыя бядняцка - серадняцкіх гаспадарак дае шырокую падставу для разьвіцьця сельска - гаспадарчай машынабудаўнічай прамысловасьці.

Паводле наперад распрацаваных пляноў на 1930-31 год, патрэбнасьць толькі ў адных сельска - гаспадарчых машынах вызначаецца больш, як у 40 млн. рублёў супроць 13 з паловай мільёнаў рублёў у гэтым годзе, г. зн. патрэбнасьць у сельска - гаспадарчых машынах павялічваецца на 300 проц.

Рэзка зьмяняецца і памарачная намёнклятура і тыпы машын. Неабходнасьць карэннага пераканструяваньня машын стане зусім яснай і зразумелай для нас, калі прыняць пад увагу, што для буйнай сельскай гаспадаркі амаль зусім не падыходзяць тыя машыны і с.-г. прылады, якія ўжываліся ў дробнай гаспадарцы. А яшчэ ня так даўно ўся вытворчасьць нашай машынабудаўнічай прамысловасьці (як СССР, так і асабліва БССР) на ўсе 100 проц. была прыстасавана да абслугоўваньня такіх дробных гаспадарак.

Ужо гэты год ясна паказаў на наяўнасьць дыспрапорцыі і розьніцу ў рэканструкцыйных тэмпах сельскай гаспадаркі і сельска - гаспадарчага машынабудаўніцтва.

У нас у гэтым годзе справа з забесьпячэньнем с. г. больш буйнымі і складанымі машынамі і прыладамі вельмі напружаная. У нас прыдзецца ў буйных гаспадарках ужываць прымітыўныя машыны і прылады, якімі карысталася дробная гаспадарка. Вось чаму асабліва сур'ёзным і важным у сучасны момант зьяўляецца пытаньне аб рэарганізацыі нашага с.-г. машынабудаўніцтва.

Трэба з усёй катэгарычнасьцю сказаць, што наша прамысловасьць аказалася зусім непрыстасаванай да сучасных тэмпаў і мэтадаў працы па абслугоўваньні сельскай гаспадаркі. Аб гэтым сьведчаць нам наступныя лічбы: удзельная вага беларускае прамысловасьці ў пляне машыназабесьпячэньня складала ў 1928-29 г. 63 проц., у 1929-1930 г. — 41 проц., а ў 1930-31 г. яна спускаецца да 14 проц. Наогул, трэба адкрыта заявіць, што за апошнія два гады Белмэталтрэстам літаральна нічога ня было зроблена ў справе рэканструкцыі вытворчасьці сельска - гаспадарчага будаўніцтва. Наадварот, у 1928 і 1929 г. Гомсельмаш паранейшаму выпускаў тыя-ж самыя прымітыўныя машыны і заказваў за мяжою для іх абсталяваньне. Ня лепш прыстасаваўся да новых тэмпаў работы і Віцебскі мэталёвы завод. Ён і пасьля праведзенай рэканструкцыі псуе матар'ял, выпускае нягодныя плугі без належнай тэхнічнай апрацоўкі.

А сёнешнія тэмпы? Яны такія-ж самыя, як і ў 1929 г. У працы гэтых заводаў амаль нічога не зьмянілася. Характэрна, што на насяджэньні Эканомнарады, якое адбылося і сакавіка, ніводзін з гэтых заводаў ня даў практычных плянаў па рэканструкцыі. Віцебскі завод падаў зусім ня грунтоўныя пляны сваёй работы ў новых умовах, а Гомсельмаш замест плянаў склаў сьпіс машын, якія трэба заказаць у Саюзсельмашы. Плян-жа рэканструкцыі заводу будзе гатовы толькі ў чэрвені месяцы.

Трэба тэрмінова распрацаваць сапраўдны генэральны плян рэканструкцыі машынабудаўнічай прамысловасьці Беларускай ССР з вызначэньнем усіх асноўных паказальнікаў будаўніцтва, аб'екты будаўніцтва, іх тыпы і маркі, тыпы абсталяваньня, крыніцы фінансаваньня і ўзоры машын па кожным аб'екце. У гэтых плянах павінна таксама быць паказана патрэбная колькасьць кваліфікаванае рабочае сілы і тэхнічнага персаналу, а таксама павінны быць вызначаны па кожным аб'екце работы каляндарныя тэрміны выкананьня. Без гэтага, без распрацоўкі такога пляну мы ня справімся з гэтай работай. Часу засталося вельмі мала. Гэта трэба памятаць і нагнаць прапушчанае.

Х. ТАЛАПІЛА.

Паскорыць адгрузку бульбы для прамысловых цэнтраў СССР

Плян веснавой загатоўкі бульбы па БССР устаноўлены ў 119.770 тон. Загатоўка павінна быць скончана да 20-га мая.

За дэкаду з 1-га па 10-га красавіка загатоўлена ўсяго 3.909 тон, што складае 3,3 проц. пляну веснавой загатоўкі.

Адстаюць усе акругі. Асабліва дрэнна праходзіць загатоўка ў бульбяных раёнах Гомельскае акругі—0,6 проц., Менскай — 2,6 проц., Магілёўскай—6,2 проц. і Бабруйскай — 5,3 проц.

Пры агульным слабым ходзе загатовак бульбы па Беларусі асабліва дрэнна вядуць работу сыстэмы с.-г. і спажывецкай каапэрацыі. Так, Белпаляводсюаз выканаў веснавы плян на 1,4 проц., Белкаапсаюз — на 2,7 проц.

Адгрузка бульбы ў іншыя раёны СССР для засеўнай кампаніі, а таксама забесьпячэньне рабочых цэнтраў Саюзу ўскладзены на Белкаапсаюз і Белпаляводсаюз.

Аднак, пры такім слабым тэмпе загатовак няма ўпэўненасьці, што плян адгрузкі бульбы будзе выкананы.

Паводле вестак «Союзплодоовощи», Белпаляводсаюз адгрузіў з 1-га сакавіка па 10-га красавіка ўсяго толькі 110 тон бульбы, Белкаапсаюз — 137 тон у той час, як, згодна нарадаў, Белпаляводсаюз павінен быў да 25-га красавіка адгрузіць 1.090 тон насеннай бульбы, а Белкаапсаюз — 2.000 тон. Да 10 мая павінна быць скончана адгрузка ўсёй бульбы для забесьпячэньня рабочых цэнтраў СССР.

Ня гледзячы на рад дырэктыў Эканомнарады, плян загатоўкі бульбы не даведзены да паасобных калгасаў, саўгасаў і сялянскіх двароў.

Ёсьць паасобныя выпадкі, калі раённыя выканкомы (Сьмілавіцкі РВК) затрымліваюць адгрузку бульбы.

Тэрмін для сканчэньня загатоўкі і адгрузкі бульбы ў прамысловыя цэнтры СССР самы кароткі.

Таму загатоўшчыкі, асабліва каапэрацыя, павінны перавесьці сваю работу на ўдарныя тэмпы, упягваючы ў загатоўчую кампанію вясковую грамадзкасьць і рабочыя брыгады, якія зараз працуюць на вёсцы.

Белпаляводсаюзу і Белкаапсаюзу трэба безадкладна камандыраваць у раёны групу работнікаў для ўзмацненьня загатовак і адгрузкі бульбы.

М. К.

МЕНСК

Пленум ЦП саюзу будаўнікоў

Сёньня ў залі пасяджэньня ЦСПСБ адкрываецца чарговы пленум ЦП саюзу будаўнікоў. Пленум абгаворыць пытаньні аб выніках калдагаворнай кампаніі, будаўнічым сэзоне, культурна-масавай рабоце сярод будаўнікоў і г. д.

Адкрылася канфэрэнцыя раб-факаў

Учора ў Менску адкрылася ўсебеларуская канфэрэнцыя рабфакаў. У рабоце канфэрэнцыі прымаюць удзел прадстаўнікі ўсіх рабфакаў БССР, дэканы і прадстаўнікі студэнцкіх арганізацый рабфакаў. Нарада працягнецца некалькі дзён.

150 ільготных літароў для рабочых

Беларускае курортнае бюро атрымала на бягучы сэзон 150 ільготных праязных літароў для выдачы рабочым, якія едуць на курорты на свой кошт. Літары выдаюцца праз прафэсыянальныя арганізацыі і непасрэдна праз курбюро.

175 бібліятэк нацыянальнае літаратуры

Белбюро ЦК чыгуначнікаў перадало ў нізавыя прафэсыянальныя органы 175 бібліятэк, якія складаюцца з літаратуры на беларускай, польскай і яўрэйскай мовах.

Расьсьледваньне прычын самагубства студэнткі Казакевіч

ЦБ пралетстуду вылучыла спэцыяльную камісію для расьсьледваньня прычын самагубства студэнткі, актыўнай грамадзкай работніцы Мар'іна-Горскага тэхнікуму, т. Казакевіч. Камісія выехала ў Мар'іну-Горку.

Аздараўляючая кампанія сярод дзяцей

НКАЗ адпусьціў каля 70 тыс. руб. на правядзеньне летняй аздараўляючай кампаніі сярод дзяцей школьнага, дашкольнага ўзросту і рабочых-падросткаў. Намечана арганізацыя фізкультурных пляцовак з харчаваньнем, дзенных санатораў і інш.

Апрача таго, цэнтральная камісія пры ЦВК БССР адпускае 16 тыс. руб. на аздараўляючыя мерапрыемствы сярод выхаванцаў дзіцячых дамоў і дзяцей беднаты. Выхаванцы дзіцячых дамоў, хворыя на косны туберкулёз будуць накіраваны для лячэньня на паўднёвы бераг Крыму.

Камандыроўкі ў інстытут чырвонай прафэсуры

Сакратарыят ЦВК БССР пастанавіў камандыраваць дадаткова ў Інстытут Чырвонай Прафэсуры на аддзяленьне права і савецкага будаўніцтва т. т. Дзьякава (намесьнік старшыні Віцебскага АВК) і Сёмкіна (інструктар Магілёўскага акругкому КП(б)Б).

За дзень

— Адбыўся выпуск 76 мэдычных сёстраў, якія скончылі 3-гадовую школу пры ЦК Чырвонага Крыжу. Усе скончыўшыя накіраваны на работу ў раёны БССР.

— У часе летніх вакацый НКАЗ мяркуе пасьлаць 200 студэнтаў 3 і 4 курсу мэдфаку БДУ на практыку ў акругі і раёны БССР.

Вымова Віцебскаму ЦРК

За поўны зрыў работы па арганізацыі прыгарадных гаспадарак Белкаапсаюз абвясьціў суровую вымову ўсяму складу Віцебскага ЦРК.

Віцебскі ЦРК дасюль арганізаваў гаспадарку на плошчы... 4-х гэктараў.

Дняпрасаюзу запрапанавана тэрмінова перадаць Віцебскаму ЦРК сто галоў буйное малочнае жывёлы.

Суд

Былы паліцэйскі Тарасэвіч

У дарэвалюцыйны час Янка Тарасэвіч займаў пасаду паліцэйскага гарадавога ў гор. Барысаве.

Кастрычніцкая рэвалюцыя разагнала паліцэйскую рутыну. Тарасэвіч прымушан быў заняцца сельскай гаспадаркай.

Наступілі цяжкія для Тарасэвіча дні: ён сумаваў, ня мог забыцца аб паліцэйскім разгуле, праца на гаспадарцы і наогул савецкія парадкі на вёсцы Тарасэвічу былі не па душы.

Але рабіць ня было чаго. Тарасэвіч часамі гнаў самагонку, піў і, не забываючыся пра старыя традыцыі, п'яным зьбіваў сваю жонку Марылю і зьдзекваўся з яе.

У 1928 г. учынкі Тарасэвіча былі выкрыты селькоркай **Мухінай** праз заметку ў газэце **«Зьвязда»**. У заметцы, між іншым, было паказана, што Тарасэвіч на грунце зайздрасьці прымусіў сваю жонку, Марылю, разьдзецца голай і хадзіць па вёсцы ў той час, калі надвор'е было надта халоднае і ішоў дождж.

Расьсьледваньнем заметка далкам пацьвердзілася. Тарасэвіч быў асуджаны на два гады пазбаўленьня волі.

Пасьля адбыцьця пакараньня Тарасэвіч вярнуўся ў вёску і пачаў прасьледаваць селькорку Мухіну. На вяллікдзень Тарасэвіч, сустрэўшы Мухіну, зрабіў замах з мэтаю забіць яе, але сваёй мэты не дасягнуў таму, што на крык Мухінай зьбегліся суседзі і вызвалілі Мухіну ад сьмерці з кіпцюроў Тарасэвіча.

За замах на жыцьцё селькоркі Мухінай Тарасэвіч прыцягнут да адказнасьці.

Справа разглядалася ў Менскім акрсудзе на падставе 22-70 арт. КК. Янка Тарасэвіч асуджан **на чатыры гады зьняволеньня з пазбаўленьнем у правох на тры гады і высылкай з БССР па адбыцьці пакараньня на пяць год.**

КАСТРОЎ Д.

Жывы карабель „капітана" Джэфрыса

У Менск прыбыў і пачынае гастролі ў рабочых клюбах нямецкі інжынэр-вынаходца Джэфрыс, які дэманструе кіраваньне караблём праз радыё.

«Капітан» Джэфрыс дэманструе мадэль морскага ваеннага карабля з усімі яго часткамі—зброя, асьвятленьне і г. д. Капітан прымушае карабель рабіць усякія рухі, страляць з гармат, асьвятляцца рознымі колерамі, па жаданьні публікі капітан прымушае карабель ехаць уперад, назад і ў розныя бакі.

Прынцып работы карабля заснаваны па перадачы радыё-хваль: на караблі ёсьць радыё-антэны, якія ловяць «загады» Джэфрыса. У залі на століку зьмешчана «катушка» Румкорфа і ключ Морзэ, якім «капітан» перадае загады караблю.

«Жывы карабель» капітана Джэфрыса дапоўнены лекцыяй аб вайсковай рабоце і тэхніцы, можна раіць усім рабочым клюбам. На гэтай лекцыі-дэманстрацыі аўдыторыя знаёміцца з тэхнікай вайны і тым шалёным тэмпам, з якім узбройваюцца капіталістыя для апошняй сусьветнай вайны.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЕНЬНЯ

Дом Камасьветы У 19 гадз. (пакой № 21) індывідуальная кансультацыя па эканом-палітыцы.

— У 19 гадз. (пакой № 3) заняткі гуртка нямецкае мовы.

БАН. У 20 гадз. агульны сход супрацоўнікаў БАН з парадкам дня: Даклад акадэміка **Вальфсона** на тэму: «Навука, рэлігія і клясавая барацьба». **Уваход вольны.**

Клюб навуковых працаўнікоў. Дакл. т. **Сянкевіча**—Чарговая задачы калектывізацыі. Пасьля дакладу—мастацкая частка. Пач. у 20 гадз. Білеты ў канцылярыі клюбу.

Да ведама навуковых працаўнікоў. Нав. працаўнікам, якія хадайнічалі аб пасылцы на курорт і ў дамы адпачынку, зьявіцца за вынікамі ў сэкцыю з 2-х да 4-х гадз. штодзенна да 20 красавіка.

БДУ. У 21 гадз. у 41 аўд. (стары будынак) адбудзецца шырокая вытворчая нарада з удзелам усяго студэнцтва факультэту саўбуду і права. На нарадку дня: 1. Дакл. дэкана факультэту т. **Канапліна** аб мэтавай установцы факультэту, 2. Мэтады актыўнага выкладаньня і з. Аб падагульненьні ведаў. Яўка студэнтаў і нав. працаўнікоў абавязкова.

АК ЛКСМБ. У 19 гадз. нарада ўсіх упоўнаважаных «Комсомольскай Правды» ячэек г. Менску. Яўка ўпоўнаважаных абавязкова і без спазьненьня.

ЗАЎТРА

Дом Асьветы. Вечар, прысьвечаны падагуленьню вынікаў 3-х месячніка пралетарскай беларускай і нацыянальскай культуры. Праграма вечару: даклад аб выніках 3-хмесячніку і мастацкая частка з удзелам слухачоў Музтэхнікуму. Білеты ў канц. Дому.

БДУ. У 17 гадз. (фіз. аўд.). Пасяджэньне Менскай сэкцыі м.-фіз. асацыяцыі. Даклады: асьпіранта **Некрашэвіча**—Навіны ў распаўсюджаньні кароткіх электра-магнэсавых хваль і дац. **Усьпенскага**—Хвалявая тэорыя матэрыі.

Пушкінская біб-ка. У 19 гадз. (1 паверх)—заняткі курсаў па падрыхтоўцы кнігаиош і заг. перасоравных бібліятэк. Тэма: **камплектаваньне біб-кі.**

Клюб саўгандальслужачых. У 20 гадз. нарада культактыву і членаў мастацкіх гурткоў. Яўка абавязкова. Запрашаюцца радавыя члены саюзу саўгандальслужачых.

Кастрычн РК КП(б)Б. У 19 г. нарада ўпоўнаважаных «Правды» і «Бальшавіка». Яўка партупоўнаважаных ячэек—абавязкова і без спазьненьня.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Дом Камасьветы. У 19 гадз.—даклад т. **Стракоўскага** на тэму: «Вынікі выкананьня прамфінпляну ў прамысловасьці БССР за першае паўгодзьдзе». Пасьля дакладу мастацкая частка. Білеты па райкомах КП(б)Б, ЛКСМБ і ў чыт. Дому.

Пушкінская біб-ка. У 18 з пал. гадз. пасядж. бібліятэчнага савету. Яўка заг. бібліятэчных аддз. і прыгарадных хатчыт. абавяз. Запраш. прадст. ад прадпрыемстваў, якія карыстаюцца перасоўкамі ад Пушкінскай біб-кі.

Заля пасяджэньня ЦСПСБ. У 18 гадз. сэктар вытворчасьці і заработнае платы склікае пашыр. нараду па пытаньні аб ходзе самаправеркі сац. спаборніцтва на Менскай акрузе. На нарадзе будуць заслуханы інфармацыі прадст. ФЗМК, вылучаных брыгадзіраў ЦСПСБ і МВІТ наступных прадпрыемстваў: заводу «Энэргія», «Камунар», «Бальшавік», абутковай ф-кі, шклозаводу, «Пралетары», «Дрэваапрацоўшчык», мясцкому № 1, вагонных майстэрань таварн., мясцкому № 3 пасажыр. і дэпо таварн., ф-кі «Кастрычнік», заводу «Домбаль» і «Чырвонае Вярэзіны» (Варысаў). Запраш. прадст. ВСНГБ, ЦК ЛКСМБ, прадстаўнікі ЦП саюзаў і рэдакцый газэт.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Сёньня роўна а 7-ай гадз. увечары ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ НК РСІ і ЦСПСБ

СКЛІКАЮЦЬ

нараду ўсіх старшынь фабрычна-заводзкіх камітэтаў і МК савецкіх, каапэрацыйных і гаспадарчых установаў,

арганізатараў вытворчых сэктараў прадпрыемстваў (альбо вытворчых камісій і эканамнарад) па г. Менску.

ПАРАДАК ДНЯ:

Шэфства рабочых над Дзярж. апаратам і арганізацыя мас вакол работы РСІ па фінкантролю (дакл. РСІ).

Яўка усіх пералічаных тав. абавязкова.

НК РСІ і ЦСПСБ.

ЦП САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ

22 красавіка а 8 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу «Саўгандальслужачы» склікае

МІТЫНГ-ЗЬЛЁТ УСІХ ВЫЛУЧЭНЦАЎ,

што працуюць на ўстаноўках гор. Менску, якія аб'яднаны саюзам саўгандальслужачых

На гэты мітынг абавязкова яўка вылучэнцаў, старшынь МК і кіраўнікоў устаноў. Запрашаюцца для ўдзелу ў мітынгу рабочыя, якія шэфствуюць над установамі, а таксама ўсе члены саюзу саўгандальслужачых.

На мітынгу рапартуюць МК: ЦРК, ВСНГ і ЯКФ аб становішчы вылучэнства, умовах працы вылучэнцаў і інш., а таксама рапартуюць па аднаму вылучэнку: Дзяржгандбелу, ЦРК і ЦСК аб умовах іх працы.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сэзон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску
Б. Лаўрэнеў.
Субота, 19 красавіка для студэнцтва
РАЗЛОМ
п'еса ў 4-х дзеях.
Рэшта білетаў у касе тэатру і ў рабочай касе. Пачатак а 8 гадз.

ХТО? ВІНАВАТЫ?

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
Мастацкі фільм вытворчасьці Савкіно
ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ
у 6 част.
Звыш праграмы кіно-хроніка Савкіно № 16.
Пач. дзен. сэанс. 1 гадз., 3 г. 20 м.
Каса з 12 г. дня.
Пач. вячэрн. сэанс. а 7 г. Каса ад 5 г. увеч.
На дзенныя сэансы цэны ад 15 к. да 35 к.

КІНО Інтэрнацыянал
Тольні 3 дні: 18, 19 і 20 красавіка
Мастацкі фільм вытворч. Савкіно
ПАБОЧНАЯ ЖАНЧЫНА
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ кіно хроніка САВКІНО
Дзенныя сэансы: 1 г. 30 м., 3 гадз.
На дзенныя сэансы ўсе білеты па 25 кап.
Каса ад 12 гадз. дня.
Вячэрнія сэансы: 7 г., 8 г. 30 м., 10 г. 20 м.
Каса ад 5 гадз.

КІНО Піталетары
2 фільмы ў адзін сэанс 2
1. Політасьветны фільм
ЗА ВАША ЗДАРОЎЕ ў 5 част.
У галоўных ролях: Чысьцякоў і Блюмэнталь-Тамарына.
2. Замежная камэдыя ЦЁМНЫ КАНЁК у 2 частках.
Пач. 1-га сэансу а 7 г. Каса з 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ паводле тэмы Янры Барбюса апавяданьня
„Здань, якая не варочаецца"
мэлядрама ў 7 частках.
Пач. 1-га сэансу а 2 гадз., 2-га—3 г. 30 м.
Каса адчынена ад 12 гадз.

КІНО Спартак
Нямецкі баявік
2-е ЖЫЦЬЦЁ
драма ў 7 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 7 г., 2-га—а 9 г., 3-га—а 10 г. 45 м.
Каса—ад 5 г. 30 м.

К-т Віцебскай Акруговай Страхавой Касы абвяшчае КОНКУРС на ўрача-загадчыка дома аднапачынку «Чырвоны Кастрычнік» пры ст. Завольша МБВ чыгункі.
Умовы: аклад утрыманьня 175 р., кватэра, апал і асьвятленьне.
Тэрмін падачы заяў да 20 красавіка г. г.

СКОРА МАСТАЦКІ ФІЛЬМ АРМЕНКІНО

ЗАМАЛУ
(МОСТ ПРАЗ БЯЗДОНЬНЕ)
Рэжысэр І. ПЕРАСЬЦІАНІ.

ЗАГАД

Асобнай Роты Сувязі 2-й Беларускай Стралковай імя т. Фрунзэ Дывізіі

16 красавіка 1930 г. Гор. Менск.

№ 4.

§ 1.

Усім пераменьнікам Асобнай Роты Сувязі—нараджэньня 1903, 1904, 1905 і 1906 г. г., якія жывуць у г. Менску і прыгараднай чарце, ЗАГАДВАЮ: зьявіцца на перарэгістрацыю ў наступным парадку: 1) усім пераменьнікам членам саюзу мэталістых зьявіцца 21-га красавіка, а 18 гадзіне ў памяшканьне Штабу Роты (вул. Карла-Маркса, 42), 2) членам саюзу саўгандальслужачых—21-га красавіка, а 20-й гадзіне, 3) членам саюзу гарбароў, швэйнікаў, харчавікоў, будаўнікоў, рабземлесу і іншым зьявіцца 22-га красавіка, а 18-й гадзіне.

Пры яўцы мець пры сабе вучотна-вайсковыя кніжкі і членскія білеты прафсаюзаў.

УВАГА: Усе пераменьнікі, якія не зьяўляюцца членамі прафсаюзаў, а таксама беспрацоўныя павінны зьявіцца к вышэйпаказанаму тэрміну. Усім прыгарадным сялянам мець на руках даведкі ад старшынь с.-с. аб маемасным становішчы, а таксама даведкі, калі ён зьяўляецца членам калгасу.

Камроты сувязі 2 ДРАЗДОЎ. Вайсковы камісар Р. С. АРЛОЎ.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДНЫМІ КАСАМІ БССР
абвяшчае, што з 15 красавіка г. г. пачалася
ПРАДАЖА ВЗЛЁСЫПЭДНЫХ АБВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ,
выпушчаных Усесаюзным аб'яднаньнем машынабудаўнічай прамысловасьці, згодна пастановы Савету Народных Камісараў Саюзу ад 26 сакавіка г. г.,
рэалізацыя якіх ускладзена на АШЧАДНЫЯ КАСЫ.
Усіх взлёсыпэдных абавязацельстваў выпушчана 350 тысяч, з якіх БССР прадастаўлена 7525.
КОШТ ВЗЛЁСЫПЭДУ УСТАНОЎЛЕН У 160 РУБ.
Абавязацельствы выпускаюцца ў 4 сэрыі:
Тэрмін абавязацельства I сэрыі —1 красавіка 1931 г.
« « II « —1 жніўня 1931 г.
« « III « —1 красавіка 1932 г.
« « IV « —1 жніўня 1932 г.
Аплачваюцца абавязацельствы ў РАСТЭРМІНОЎКУ.
Падпісчыкам абавязацельстваў даецца права аплачваць кошт взлёсыпэду ПОЎМЕСЯЧНЫМІ, МЕСЯЧНЫМІ АБО КВАРТАЛЬНЫМІ (3-х месячнымі) узносамі ў строга вызначаных сумах, у залежнасьці ад сэрыі абавязацельстваў.
На сумы, унесеныя для аплаты абавязацельстваў, налічваецца ў карысьць уласьнікаў абавязацельстваў 6 проц. гадавых.
Пасьля поўнай аплаты абавязацельстваў уласьнікі іх неадкладна атрымліваюць са складу «ДЗЯРЖШВЭЙМАШЫНЫ» НА РУКІ ВЭЛЁСЫПЭД (выпуску маскоўскага, пензенскага або харкаўскага заводаў)
Падпіска прымаецца ва ўсіх ашчадных касах (акрамя агенцкіх) і філіялаў Дзяржбанку ў межах вызначанай колькасьці взлёсыпэдаў, прадастаўленай кожнай касе.
Падпіска прымаецца індывідуальная і калектыўная ад асобных калектываў рабочых і служачых і членаў калгасаў.
Взлёсыпэды выключна МУЖЧЫНСКІЯ.
Абавязацельствы прадаюцца толькі працоўным. Кожны падпісчык мае права толькі на адно взлёсыпэднае абавязацельства.
Падпіска на взлёсыпэдныя абавязацельствы заканчваецца 1 ліпеня 1930 г.
Кіраўніцтва ашчадкасамі БССР.

НАВІНКІ
С. БАРКОЎСКІ.
Першае Мая на Беларусі.
Стар. 47. Цана 16 кап.
Бібліятэка чырвонаармейца.—С. ЮШКОЎ.
У наступленьні.
Стар. 47. Цана 15 кап.
Г. СУШКІН.
Сялянскія паўстаньні у 1905 годзе—апавяданьні.
Стар. 63. Цана 18 кап.
А. ДЗЯРКАЧ.
Бог удвох—сучасная сатыра.
Стар. 59. Цана 35 кап.
Э. БЯДУЛЯ.
На зачарованых гонях, зборнік апавяданьняў—выданьне трацце запоўненае і папраўленае аўтарам.
Стар. 209. Цана 1 р. 65 к.
Белдзяржвыдавецтва.

ВЫХОДЗІЦЬ З ДРУКУ І РАССЫЛАЕЦЦА ЎСІМ ПАДПІСЧЫКАМ
№№ 6-7 №№ 6-7
„ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК"
Зьмест 6-7 нумару.
Гантман.—Баявыя задачы дня.
Партыйная работа на вёсцы.
Танхілевіч.—Аб перабудове працы вясковых партарганізацый.
Шматноў.—Узмацніць бальшавіцкую пільнасьць вясковых арганізацый.
Лабадаеў.—Нататкі з фронту калектывізацыі.
Партыйнае кіраўніцтва на прадпрыемствах.
Шпэктараў.—Як мы перабудоўваем партыйна-масавую працу на прадпрыемствах.
М. Шапіра.—Кіраўніцтва ўдарным рухам не заняло належнага месца ў партработе на прадпрыемствах.
У камсамоле.
Палякоў.—Палепшым парткіраўніцтва ЛКСМБ.
Работа НК РСІ.
Зерніцкі.—За перабудову форм і мэтадаў масавай працы органаў КК РСІ.
Бібліяграфія.
Рэзалюцыі II Пленуму ЦК КП(б)Б.
Рэзалюцыі Пленуму ЦКК КП(б)Б.
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 м-ц —25 кап. | 6 м-цаў—1 р. 50 кап.
3 м-цы—75 кап. | На 1 год—2 р. 75 кап.
Кошт асобнага нумару 15 кап.
ПАДПІСКУ ПРЫМАЮЦЬ: галоўная кантора газэты «Зьвязда», Бюро падпіскі Белдзяржвыдавецтва і Дзяржвыдавецтва РСФСР і ўсе паштовыя аддзяленьні і лістаносцы.

АБВЕСТКА.
Даводзіцца да ведама ўсіх будаўнічых арганізацый і забудоўшчыкаў, што на падставе пастановы Прэзыдыуму Гарсавету ад 2-III г. г.
аб аб'яднаньні кар'ераў па распрацоўцы ГРАВІЯ, ГЛІНЫ І ПЯСКУ
з 16 красавіка г. г. РАСПАЧАЛА СВАЮ ДЗЕЙНАСЬЦЬ
„Аб'яднаная Кантора па распрацоўцы кар'ераў",
якая зьмяшчаецца па Ленінскай вул. у доме № 28/86.
Распрацоўка і вывазка гравія, гліны і пяску з кар'ераў без належнага дазволу канторы БУДАЎНІЧЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ і забудоўшчыкам ЗАБАРАНЯЕЦЦА.
Аб'яднаная Кантора па распрацоўцы кар'ераў.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Разьлік. кн. Пешіка У. П., выд. Гандальбудам. 625
Пашпарт, выд. Мен. міліцыяй, вайсковы білет, пасьведч., выд. Смалявіцк. л-вам, пяць загадаў да лесаруб. біл. Каранкевіча А. М. 627-630
Дапрыз. кн. Кагана Р. І., выд. Мен. ваенкаматам. 631
Лек. кн. Трашкевіч Д. М., выд. Мен. Акрсабезам. 632
Вайск. адрэз. «В» Фадзеева П. П., выд. маб. аддз. Зах. чыг. 633
Пасьведч. кіно-мэханіка Станішэўскага Л. І., выд. Белдзяржкіно 634
Пасьведч. аб сканчэньні 2 Мен. вяч. школы раб. мол. Станішэўскага Л. І. 635
Каап. кн. № 4844 Пораха Г. П., выд. Мен. прыгар. спаж. т-вам «Земляроб» 637
Асабов. кн. Касьцяневіча М. С., выд. Астр.-Гарадзецк. РВК. 638
Чл. біл. саюзу будаўнікоў № 6-3213 Кучынскага С. М. 639
Парт. біл. № 0813027, выд. Калінінск. АК КП(б)Б, чл. біл. саюзу друкароў № 147784, вайск. біл., выд. Калінінск. ваенкаматам, пасьведч. на права нашэньня зброі, выд. Калін. ДПУ, кн. касы ашчадн., лек. кн., выд. Мен. страхкасай на імя Юргелевіча П. Я. 640-645
Каап. наборная кн. Вержбіцкага М. Д., выд. ТПО МБВ ч. 646
Каап. кн. № 2766 Сьцефановіча П. А., выд. Мен. прыгар. спаж. т-вам «Земляроб» 647
Чл. біл. саюзу СГЛР № 1411
Ржэчыцкага А. А. 648
Вайск. кн. Царыка Т. Я., выд. Мен. ваенкаматам. 649
Вуч.-конск. кн. Мурашка П. В., выд. Лагойск. РВК. 650
Бірж. талён, выд. Мен. біржай працы, даведка аб працы, выд. саўгасам «Серп», Сьмілавіцк. р-ну на імя Астахавай А. А. 651-652
Лек. кн. Сасінскага А. А., выд. Мен. страхкасай. 653
Бірж. талён Каранкевіч О. С., выд. Мен. біржай працы. 654
Пашпарт, выд. Крэменчуг. міліцыяй, вайск. біл., выд. Крэменчуг. ваенкаматам на імя Высмана А. Г. 655-656
Даведка аб працы Рэлькіна А. Ш., выд. 5 арц. інвалідаў. 657
Выкананьне Мен. біржы працы Калінаўскай З. Н. 658
Пашпарт Еўсевіч М. П., выд. Шацк. с.-с. 659
Бірж. талён № 3301, выд. Мен. біржай працы, характ., выд. Астр.-Гарадзецк. 7-годкай на імя Мультана М. Р. 660-661
Вуч. вайск. біл. Рольніка Л. Б., выд. Мен. ваенкаматам. 662
Пашпарт Лукомскага С. О., выд. Мен. міліцыяй 663
Чл. біл. саюзу будаўнікоў Зільбэрглейта А. М. 664
Лек. кн. Зільбэрглейта А. М., выд. Мен. страхкасай. 665
Пасьведч. аб сканчэньні 15 Мен. 7-годкі Бабінкага В. А. 666
Вайск. кн. Сарока М. Ф., выд. Лагойск. РВК. 667

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск, Галоўлітбел № 337.